ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 211 (3319) Нядзеля 15-га верасьня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

ВАШЫНГТОН, 14. Міністр замежных спраў ПАЗШ Стымсом заявіў, што паміж Амэрыкай і Англіяй дясягнута згода аб скліканьні канфэрэнцыі па марскім разбраеньні ў сьнежні м-цы. На канфэрэнцыю запрашаюцца Францыя, Італія і Японія.

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

БАБРУЙСК, 14. (Наш спэц. кар.). Рабочыя гораду на радзе сходаў пастанавілі абвясьціць сьвятам дзень адкрыцьця манэўраў, адпрацаваўшы гэты дзень у бліжэйшую нядзелю.

Пачынаюцца вялікія бабруйскія манэўры

Знаходзячыся на рубяжы сацыялістычнага і капіталістычнага сьвету, БССР была, ёсьць і будзе верным фарпостам заваяваньняў Кастрычніка

Беларусізацыю на вышэйшую ступень

Пралетарыят БССР налічвае ня мала буйнейшых дасягненьняў у галіне разьвіцьця беларускай нац. культуры. Гэта прызнаюць нават ворагі нашы за межамі. Гэтых дасягненьняў ня ў стане затушаваць і тыя прарывы на культурным фронце, аб якіх мы цяпер так шмат гаворым і пішам. Сам факт, што мы так бязьлітасна выкрываем гэтыя прарывы, паказвае іменна на нашу сілу, па тое, што пралетарыят Беларусі сапраўды шчыльна падыйшоў да «аўладаньня культурнымі цэннасьцямі».

Аднак, такое становішча не павінна ўсыпляць нашай пільнасьці. Ні ў якай ступені мы ня можам «адпачываць на лаўрах». Работы так многа, задачы такія цяжкія, абстаноўка такая складаная, што толькі непарыўна ўзмацняючы наша наступленьне на ўсіх франтох, у тым ліку і на культурным, мы здолеем, замацоўваючы нашы дасягненьні, ісьці да новых перамог.

Беларусізацыя — адзін са сродкаў, і прытым магутных, гэтага наступленьня. Таму цяпер, у даных умовах, гэты сродак, гэта прылада павінна быць намі адточана, як ніколі раней. **Беларусізацыя павінна быць пастаўлена на вышэйшую ступень.**

На жаль, даныя з месц (надрукаваныя часткова і ў сёньнешнім нумары нашай газэты кажуць аб тым, што дзе-ні-дзе гэта зброя ляжыць заіржавелай, або напоўзаіржавелай, што дзе-ні-дзе гэтай зброяй не карыстаюцца ў поўнай меры. Мы павінны самым рашучым чынам папярэдзіць гэта. Пастановы партыі і савецкай улады прымаюцца не для таго, каб з імі можна было марудзіць або тым больш іх «забываць».

Трэба зразумець, што разрыў, або хоць-бы неадпаведнасьць паміж тэмпам нашага ўзмоцненага наступленьня і тэмпам беларусізацыі пагражае цяжкімі вынікамі. Трэба зразумець, што гэта неадпаведнасьць, а тым больш разрыў, можа быць на руку **толькі** клясаваму ворагу, шавіністым усіх масьцей. Трэба зразумець, што вялікарускі шавінізм, які зараз прытаіўся, можна сказаць, сьпіць і бачыць, як-бы скарыстаць такую неадпаведнасьць, калі яна будзе мець месца. Мы сыгналізуем аб гэтай небясьпецы. Трэба ўсямерна ўзмацніць тэмп беларусізацыі ва ўсіх нашых установах і органах зьнізу і да верху.

Трэба са значна большай рашучасьцю і неадкладна праводзіць у жыцьцё шматлікія, якія ёсьць наконт гэтага, пастановы.

Трэба правяраць выкананьне гэтых пастаноў.

Правакацыя кітайскіх генэралаў канчаткова выкрыта

Нанкінскія дыплёматы сьвядома блытаюць адказ Савецкага ураду

Кітайская буржуазія робіць новую спробу абвастрыць савецка-кітайскія адносіны

Адказ нанкінскага ураду на прапанову ўраду СССР.

МАСКВА, 13. 11-га верасьня 1929 г. Народным Камісарыятам па замежных справах СССР атрыманы праз нямецкае пасольства ў Маскве адказ кітайскага ўраду на прапанову ўраду СССР падпісаць супольную дэклярацыю наступнага зьместу:

1. Нацыянальны ўрад Кітаю ня раз выказваў сваю гатоўнасьць уступіць у перагаворы з савецкім урадам з мэтаю дасягненьня справядлівага і прыемлемага вырашэньня нядаўніх спрэчак. Нацыянальны ўрад таму прыязны савецкаму ўраду за выражэньне з яго боку гатоўнасьці падпісаць, па дасягненьні згоды паміж абодвума бакамі, супольную дэклярацыю і поўнасьцю згаджаецца на тое, каб канфэрэнцыя была адкрыта, як мага хутчэй, каб прадстаўнікі абедзьвюх краін маглі прыйсьці да канчатковага ўрэгуляваньня ўсіх пытаньняў, ня вырашаных паміж абедзьвюма краінамі.

2. Нацыянальны ўрад не супярэчыць супроць прапановы савецкага ўраду, каб у артыкуле 3-м супольнай дэклярацыі было дана слова «безадкладна» праз «рэкамэндуем», але, на жаль, ня бачыць магчымасьці згадзіцца з прапановай аб назначэньні новага кіраўніка і памочніка кіраўніка, у якасьці папярэдняе ўмовы для падпісаньня пмянёнае дэклярацыі, або для адкрыцьця канфэрэнцыі, паколькі такая працэдура супярэчыла-б агульнаму прынцыпу, выкладзенаму ў артыкуле 2-м праекту дэклярацыі, які ўжо быў прыняты савецкім урадам.

3. Што датычыць прычын паправак, прапанаваных савецкім урадам, дык нацыянальны ўрад прытрымліваецца тае думкі, што яны ў поўнай меры могуць быць пакінуты для разгляду на надыходзячай канфэрэнцыі; калі-ж канфэрэнцыя вырашыць на карысьць прапанаваных паправак, дык нацыянальны ўрад ня будзе супярэчыць супроць іх прыняцьця.

4. Нацыянальны ўрад прапануе, каб канфэрэнцыя мела месца ў Бэрліне, замест Масквы, як гэта прапанавалася савецкім урадам і, таксама спадзяецца, што падпісаньне намечанай супольнай дэклярацыі прадстаўнікамі абодвух бакоў будзе таксама мець месца ў Бэрліне.

АД ТАССУ: Паводле вестак у ТАСС, адказ ураду СССР будзе паведамлены кітайскаму ўраду і апублікаваны ў друку ў бліжэйшыя дні.

***

Нанкін адхіліў усе мінімальныя папраўкі, якія савецкі ўрад лічыць неабходным унесьці ў прапанаваны кітайскім урадам праект супольнае дэклярацыі. Адказ нанкінскага ўраду, атрыманы з Жэнэвы, цалкам апраўдаў тую стрымманасьць і недавер'е, з якім працоўныя СССР аднесьліся да прапаноў Нанкіна, перададных 28-га жніўня праз нямецкае пасольства і давёў з поўнай відавочнасьцю, што гэтыя мніма-міралюбныя прапановы былі толькі чарговым правакацыйным манэўрам, зараз канчаткова выкрытым.

Савецкі ўрад лічыў неабходным выказаньне Нанкіным згоды на неадкладнае назначэньне кіраўніка і яго памочніка, што зьяўляецца толькі ўдакладненьнем прапановы, зробленай самім Нанкіным.

Гэта агаворка патрэбна была і яшчэ таму, што неадкладнае назначэньне кіраўніка і яго памочніка магло гарантаваць нас ад выпадковасьцяй кітайскае ўнутрыпалітычнае барацьбы, у выніку якой фактычныя гаспадары Манчжурыі (Мукдэн) маглі-б засупярэчыць правядзеньню гэтага кардынальнага патрабаваньня савецкага ўраду ў жыцьцё.

Адказ нанкінскага ўраду сьведчыць аб тым, што Нанкін або прабаваў ашукаць савецкі ўрад і гэта мізэрная спроба аказалася выкрытай дзякуючы нашай папраўцы, або (што таксама ня выключана) пад уплывам новых акалічнасьцяй, у якіх не малаважную ролю адыгрывае Жэнэва, нанкінцы рашылі дакладна паўтарыць ранейшы трук Мукдэна і бяруць зараз назад сваю першапачатковую прапанову.

Нанкінскі ўрад заяўляе аб тым, што фактычнае назначэньне кіраўніка і яго памочніка павінна быць праведзена ў адпаведнасьці з пунктам другім дэклярацыі, г. зн. на самой канфэрэнцыі. Гэта пазбаўляе даную Нанкіным у праекце супольнае дэклярацыі згоду на назначэньне кіраўніка якога-небудзь практычнага значэньня і сьведчыць толькі аб новай, загадзя ахвяраванай на правал спробе Нанкіна ўцягнуць нас у перагаворы на падставе хоць-бы і часовай легалізацыі таго недапушчальнага становішча свавольства і гвалтаў, якое стварылася на чыгунцы ў выніку захопу.

Дасканалай ілюстрацыяй да фальшывых прыёмаў нанкінскае дыплёматыі зьяўляецца тая адкрыта жульніцкая ператрымка, якую Нанкін дапусьціў у адносінах нашага адказу, забыўшыся, як відаць на тое, што адказ гэты таксама, як і нанкінскі праект дэклярацыі быў у свой час намі апублікаваны для ўсеагульнага ведама. Усім вядома, што савецкі ўрад запрапанаваў фармуляваць пункт 3-ці супольнай дэклярацыі наступным чынам:

«Савецкі ўрад рэкамэндуе кіраўніка і памочніка кіраўніка К.-Усх. чыг., якія будуць безадкладна назначаны праўленьнем памянёнае чыгункі». Нанкінскі ўрад тым ня менш мае нагласьць заявіць у сваім адказе, што ён «ня супярэчыць супроць прапановы савецкага ураду ўставіць слова «безадкладна» перад словам «рэкамэндуе», у той час, як савецкі ўрад ніколі падобнае прапановы не даваў, а як відаць з вышэйпамянёнага, настойваў на неадкладным назначэньні.

Ня лепш стаіць справа і з іншымі папраўкамі савецкага ўраду да нанкінскага праекту дэклярацыі. Як вядома, Нанкін прапануе ў тым-жа пункце 3-м свайго праекту ўскласьці на савецкі ўрад абавязак праінструктаваць савецкіх рабочых і служачых К.-Усх. чыг. і сурова выконваць арт. 6 Пейпінскае згоды. Савецкі ўрад прыняў гэту прапанову пры ўмове, калі яна будзе прарэдагавана ў тым духу ўзаемнасьці, у якім складзены арт. 6-ты і калі кітайскі ўрад возьме на сябе той-жа абавязак праінструктаваць свае мясцовыя ўлады, якія ўпарта ідуць па шляху правакацый і гвалтаў над савецкімі грамадзянамі. Гэта папраўка тым больш неабходна і своячасова, што кітайскія ўлады сыстэматычна падтрымлівалі і падтрымліваюць белагвардзейскія тэрарыстычныя арганізацыі, якія адкрыта вядуць пагромную антысавецкую работу на тэрыторыі Кітая, і шырока карыстаюцца паслугамі белых банд, якія робяць налёты на нашу тэрыторыю. Нанкін, аднак, у сваім адказе прапануе зрабіць савецкую папраўку прадметам абгаварэньня на канфэрэнцыі, думаючы, такім чынам, як і раней, падтрымліваць самы цесны кантакт з белагвардзейскімі арганізацыямі і бандамі, якія ўжо выклікалі сваёй дзейнасьцю рад сутычак на граніцы і ствараюць небясьпеку яшчэ больш сур'ёзных ускладненьняў. Зусім бясспрэчна, што Нанкін робіць новую шалёную спробу абвастрыць савецка-кітайскія адносіны, спадзяючыся дабіцца паабяцанага кімсьці з жэнэўскіх міратворцаў умяшаньня і дапамогі.

Мы ня сумняваемся, аднак, у тым, што гэтая ілжывая і мізэрная падвойная гульня ахвяравана на ганебны правал. Працоўныя масы Савецкага Саюзу аднадушна падтрымліваюць цьвёрдую і вытрыманую палітыку свайго ўраду. Але працоўныя СССР гатовы таксама ў кожны момант мабілізаваць усе сілы для моцнага адпору кітайскім генэралам і што стаяць за іх сьпінамі імпэрыялістым.

(«ПРАВДА»).

Просяць савецкі ўрад дазволу на прыезд у СССР

СТАКГОЛЬМ, 13. 2 месяцы назад з дазволу савецкіх улад пераселіліся з Украіны назад у Швэцыю сяляне-швэды з вёскі Гамаўсвэнксбю. З гэтае прычыны швэдзкія газэты паднялі вялікі шум і быў створаны асобны камітэт для падрыхтоўкі прыёму рэпатрыянтаў і дачы ім працы ў якасьці с.-г. рабочых. У сучасны момант 4 сям'і, з ліку выехаўшых з СССР (усяго 23 чалавекі), зьвярнуліся да савецкага ўраду з просьбаю дазволіць им вярнуцца на Украіну.

Орган швэдзкай кампартыі «Фолькэс Тагбладэт Політыкэн» з гэтае прычыны піша:

«Адносіны да бастуючых с.-г. рабочых у Мэры паказалі перасяленцам, які лёс с.-г. пралетарыяту ў капіталістычных краінах». (ТАСС).

Як гаспадараць на К.-Усх.чыг. кітайскія белабандыты

ТОКІЁ, 12. Як падаюць з Харбіну ад 12-га верасьня, станцыя Пагранічная вусім апусьцела. Каса станцыі разграблена. Пакрадзены таксама білетныя кнігі і ўся маёмасьць касы. Электрастанцыя і тэлефон ня дзейнічаюць. Палатно паміж Пагранічнай і Мулінам вабіта арбамі і фурманкамі ўцекачоў. На гэтым вучастку курсуюць толькі вайсковыя цягнікі. Прадстаўнікі новай адміністрацыі на К.-Усх. ч. зазначаюць журналістым наступнае:

«На вучастку Мулін—Пагранічная вусім няма пасажыраў, а таму мы скарачаем там рух».

Ва ўсіх аддзелах кіраўніцтва і прадпрыемствах К.-Усх. ч. наглядаецца вялічэзнае разбуханьне апарату за кошт бязупынна прымаемых на службу кітайцаў. На месцы аднаго ранейшага санецкага служачага цяпер сядзяць па 5-6 кітайцаў. Нагляды паказваюць, што на службу прымаюцца не спэцыялісты, а пераважна, паліцэйскія, былыя ўрадовыя служачыя, асабліва, шпікі. Сялянскія фурманкі затрымліваюцца ў гарадох і мабілізуюцца для ваенных патрэб.

У Харбіне расклеены кітайскія плякаты з лёзунгамі: «Вернем К.-Усх. ч. Кітаю», «Вайна чырвоным».

На станцыі Манчжурыя арыштавана група настаўнікаў—савецкіх грамадзян. Арыштаваныя дастаўлены ў Харбін. (ТАСС).

Да ўсіх рабочых і работніц, да ўсіх служачых і працоўнай інтэлігенцыі

Таварышы!

На тэрыторыі БССР зараз адбываюцца манэўры Чырвонай Арміі. Манэўры—гэта падагульваньне зімовай і лягернай вучобы чырвонаармейцаў, праверка баявой падрыхтоўкі часьцей Чырвонай Арміі і гатоўнасьці да абароны Савецкай Краіны.

Таварышы! Гэтыя манэўры праводзяцца у час, калі рабочыя Савецкай Беларусі, у цесным саюзе з рабочай клясай усяго Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі, мабілізуюць усе свае сілы і творчую энэргію праз сацыялістычнае спаборніцтва, для ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва. Па гарадох будуюцца фабрыкі, заводы, электрастанцыі, школы, клюбы і г. д. У вёсцы бедняцкае і серадняцкае сялянства, у блёку супроць кулака і міраеда, пад кіраўніцтвам пралетарыяту гораду, арганізоўвае магутныя калектыўныя гаспадаркі, узмацняе саўгаснае будаўніцтва, арганізоўвае машына-трактарныя станцыі — забясьпечваючы гэтым разам з індустрыялізацыяй краіны правядзеньня пляну вялікіх работ, пляну пабудовы сацыялізму у нашай Краіне.

Але, дарагія таварышы, усе гэтыя магутныя гіганцкія работы няухільна праводзяцца ў умовах упорнага працівадзеяньня капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі, у ўмовах абвостраная клясавай барацьбы ў нашай краіне.

З другога боку, нашы вялікія дасягненьні ў сацыялістычным будаўніцтве выклікаюць шаленства ў лягеры міжнароднага імпэрыялізму, які ў сучасны момант з асаблівай сілай пры актыўным падтрыманьні сацыял-фашыстых усіх рангаў і калёраў, рыхтуе напад супроць СССР.

Аб гэтым яскрава сьведчаць падзеі на Кітайска-Усходняй чыгунцы, дзе кітайскія генэралы разам з рэшткамі белагвардзейцаў робяць налёты на Савецкую мяжу.

Таварышы! У гэты час, уся наша ўвага рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі! Усе нашы сілы на узмацненьне яе баявых шэрагаў! Усе нашы магчымасьці для ўзмацненьня нашай штодзённай сувязі з Чырвонай Арміяй, гэтым верным вартаўніком нашых Кастрычніка-вых заваёў і пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва.

Таварышы рабочыя! У гэты час мы усе павінны асаблівую ўвагу ўдзяліць ваенізацыі нашых радоў; мы павінны навучыцца дасканала аўладаць вайсковымі ведамі, каб у патрэбны момант абараніць нашы заваёвы—гэта зьяўляецца ганаровым абавязкам кожнага рабочага, кожнага працоўнага. Вось чаму манэўры Чырвонай Арміі, якія ў нас у БССР зараз праводзяцца, набываюць вялізарнае значэньне і ўсе мы павінны ўсякім чынам дапамагчы, каб забясьпечыць пасьпяховае іх правядзеньне.

Таварышы рабочыя, работніцы і служачыя!

У часе манэўраў часьці Чырвонай Арміі будуць асабліва шчыльна стыкацца з грамадзянскім насельніцтвам. Мы павінны акружыць кожную часьць, кожнага чырвонаармейца любоў'ю і таварыскай, братэрскай цеплатой. Кожны чырвонаармеец павінен глыбока адчуваць усю сілу, усю моц рабочых мас і ўсіх працоўных і штодзённыя нашы клапоты ад добрабыту Чырвонай Арміі, аб узьняцьці яе баяздольнасьці, аб узьняцьці яе культурнага ўзроўню.

Мы павінны скарыстаць манэўры для ўзмацненьня нашай баявой падрыхтоўкі і каб, наглядаючы за манэўрамі, яшчэ больш загартаваць сябе, каб стаць байцом за абарону нашай сацыялістычнай бацькаўшчыны, за справу сусьветнае рэвалюцыі.

ЦСПСБ заклікае ўсіх рабочых і служачых, усіх сяброў прафсаюзаў да актыўнай дапамогі, а арганізаваныя прь клюбах і чырвоных кутках вайсковыя гурткі, ячэйкі Асоавіяхіму на прадпрыемствах—да актыўнага ўдзелу ў правядзеньні манэўраў.

Дружная, адзіная праца Чырвонай Арміі, рабочых і ўсіх працоўных у правядзеньні манэўраў паслужыць залогам узмацненьня абароназдольнасьці СССР і забясьпячэньня сацыялістычнага будаўніцтва.

Да гэтага ЦСПСБ заклікае усіх рабочых, служачых і працоўную інтэлігенцыю.

Няхай жыве Каміністычная партыя!
Няхай жыве СССР!
Няхай жыве Чырвоная Армія—узброены атрад пралетарскай рэвалюцыі і надзейны вартаўнік Савецкіх межаў!
Няхай жыве рабочая кляса!
Няхай жыве непарушная сувязь рабочых і сялян з Чырвонай Арміяй!

ЦСПСБ.

Выкрыцьцё буйнае шкодніцкае арганізацыі ў судатрэсьце

ЛЕНІНГРАД, 11. ДПУ выкрыла ў Ленінградзе буйную шкодніцкую арганізацыю шахцінскага маштабу. У склад яе ўваходзілі выдатныя спэцыялісты судатрэсту: 1) Кастэнка—член праўленьня Судатрэсту па тэхнічнай частцы, фактычны тэхнічны дырэктар трэсту; 2) Кандрацьцеў—загадчык тэхнічна-вытворчым аддзелам трэсту; 3) Вілер—кандыдат у члены праўленьня трэсту; 4) Ладыжэнскі—нам. загадчыка фінсавa - камэрцыйным аддзелам; 5) Кастэнка (брат папярэдняга)— заг. пададдзелам абсталяваньня суднаў; 6) Абуаддзелам абсталяваньня суднаў; 6) Абухаў — тэхнічны дырэктар суднабудаўнічага заводу «Северная Верфь»; 7) Зварыкін—галоўны карабельны інжынэр «Северной Верфи»; 8) Сакольскі—загадчык суднабудаўнічым цэхам «Северной Верфи»; 9) Скорчэлец—тэхнічны дырэктар Балтыцкага заводу і інш.

Арганізацыя гэта, як зараз ужо дакладна ўстаноўлена сьледзтвам і ўласным прызнаньнем злачынцаў, **ставіла сабе асноўнай мэтай скінуць савецкую ўладу. Сродкамі** для дасягненьня гэтай мэты зьяўляліся **шкодніцтва і дэзарганізацыя** савецкае гаспадаркі. Процідзеяньне аднаўленьню і разьвіцьцю суднабудаўніцтва, зрыў праграм, вывад са строю суднавых адзінак, закупка заграніцаю і ўнутры краіны непатрэбнага абсталяваньня, ілжывыя даклады ў вышэйшых інстанцыях, складаньне няправільных прамфінплянаў і г. д.

Бліжэйшай-жа мэтаю шкоднікаў было давесьці няздольнасьць савецкай улады арганізаваць сваё суднабудаўніцтва і паставіць Судатрэст перад неабходнасьцю перадаць свае заказы за граніцу.

Пачатак савецкага будаўніцтва адносіцца да 1924 году, да таго-ж часу адносіцца і пачатк шкодніцкае дзейнасьці названае групы асоб. Калі ўзяць, напрыклад, пабудову нафтаналіўных суднаў «Азнефти» і «Грознефти», якія былі перароблены з недабудаваных царскіх крэйсэраў, дык аказваецца, што паводле каштарысу, складзенаму пад кіраўніцтвам Кастэнкі, кошт кожнай перабудовы павінен быў скласьці суму ў 1.300 тыс. руб.

На справе-ж выйшла 3.500 тыс. руб. Замест кастрычніка 1925 г. пабудова была закончана ў студзені 1927 г., г. зн. са спазьненьнем амаль на паўтара гады. Замест грузапад'ёмнасьці ў 7 тыс. тон, выйшла 5 тыс. тон. Замест таго, каб дабудаваць **гэтыя судны** і выпусьціць іх па простым прызначэньні—па абарону краіны, яны паводле настойлівасьці Кастэнкі, **былі** па сутнасьці справы **сапсаваны.** Акт аб прыёме быў складзен з такімі агаворкамі, што па сутнасьці ён зьяўляўся актам аб забракаваньні. І сапраўды, пасьля кожнага рэйсу судны гэтыя паступалі ў доўгі рамонт. Усё **гэта было загадзя вядома** ўдзельнікам шкодніцкай шайкі на Балтыцкім заводзе і «Паўночнай Вэрфі», дзе перабудоўваліся гэтыя судны.

Таксама такі-ж малюнак быў і з першымі савецкімі рафрыжэратарнымі суднамі «Рыкаў» і «Рудзутак», адбудаванымі са спазьненьнем амаль на два гады супроць тэрміну. Каштавалі яны замест 2.400 тыс. руб. па 5.200 тыс. руб. кожны. У часе пабудовы высьвятлялася кожны раз, што будаўнічыя чарцяжы складзены няправільна, на гэта зьвярталіся увагу рабочыя. **Ніводзін рэйс не адбываўся без аварыі.**

Поўная анархія вытворчасьці была на Балтыцкім заводзе і ў часе пабудовы лесавозаў. Пасьля пабудовы ў акты трэба было ўнесьці звыш 100 пунктаў, што зьмяшчалі апісаньне недахопаў. На лесавозах былі пастаўлены, напрыклад, нягодныя паравыя дынамо, з прычыны чаго лесавозы «Іскра» і «Рабочий» пацярпелі аварыю.

У кожным прадпрыемстве трэсту наглядаўся значны перавыдатак супроць каштарысу, які складаў сотні тысяч рублёў, і незразумелыя зацягнаньні і спазьненьні гадамі ў тэрмінах.

У той-жа час **газаканпрэсорная ўстаноўка** Бальтзаводу, цаной у паўмільёна **была перадана** Рудмэталягандлю **на лом** за 30 тыс. руб., **зруйнавана зусім новая Ўсьць-Ижорская Вэрф. Прадана на злом новае адміралцейства,** а праз паўгода было затрэбавана ад Галоўмэталю 500 тыс. руб. на аднаўленьне таго-ж новага адміралцейства. Апошнюю, сапраўды пякельную махінацыю правялі Ўладзімер Кастэнка і Кандрацьцеў. **Заграніцай закупалі спэцыяльнае дзерава «цік» і «бакаўт», а потым прадавалі яго з прычыны непатрэбнасьці.** Тое-ж самае было са сталью спэцыяльных профіляў. Кожная такая апэрацыя каштавала сотні тысяч рублёў, пры чым—чыстым золатам. **А закуплены** ў вялізнай колькасьці **ў Чэхаславакіі чыгун аказаўся якасьцю ніжэй савецкага.**

Даволі наглядзець у мінулае гэты шкодніцкаў, ясна стане, што інакш дзеінічаць яны не маглі. **Уладзімэр Кастэнка,** напрыклад, у мінулым—член Ц партыі эсэраў і **лідэр мікапаеўскай арганізацыі эсэраў.** У часе акупацыі Міка лаева немцамі, саюзьнікамі і Дзянікіным Кастэнка быў там гарадзкім галавой. Яго брат **Васіль Кастэнка**—у мінулым **меншавік. Зварыкін**—былы патом ны дваранін, **манархісты, і нацыяналісты.**

Такія і ўсе астатнія шкоднікі—цесная група, якая перайшла ў Суднатрэст з мікалаеўскіх суднабудаўнічых заводаў «Наваль», якія належалі ў «добры стары час» французскаму капіталу.

Агульная сума страт, зробленая савецкай дзяржаве шкоднікамі з Судатрэсту, складае 18 млн. руб.

***

ХАРКАЎ, 14. Заслухаўшы паведамленьне аб выкрыцьці контр-рэвалюцыйнага шкодніцтва ў Ленінградзкім суднабудаўнічым трэсьце інжынэры і тэхнікі «Юго-Сталь», «Хэмстрой» і «Дзивугалю» кляймяць ганьбаю і адмяжоўваюцца ад усіх шкоднікаў, што зрываюць гіганцкую работу па сацыялістычным будаўніцтве. (ТАСС).

Польская рабоча-сялянская дэлегацыя ў Негарэлым

НЕГАРЭЛАЕ 14-IX (Наш кар.). У Негарэле прыбыла з Койданава польская рабоча-сялянская дэлегацыя ў складзе 16 чал. На вакзале дэлегатаў сустракалі рабочыя-чыгуначнікі. У часе свайго побыту ў Негарэлым польскія госьці наведалі сельсавет, школу і прыймовы пакой, дзе знаёміліся з пастаноўкаю работы. Акрамя таго, дэлегаты пабывалі ў в. Рудні і вялі гутарку з сялянамі.

На мітынгу, які адбыўся ў в. Рудні ў зьвязку з прыездам польскіх таварышоў, выступіла работніца - тэкстыльшчыца з г. Лодзі і зазначыла на цяжкае становішча работніц у Польшчы.

Дэлегаты засталіся вельмі здаволены працаю сельсавету і ўсім тым, што яны бачылі тут, і абяцалі па сваім звароце ў Польшчу расказаць аб вялікім размаху сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР.

Польская рабоча-сялянская дэлегацыя ў т. Чарвякова

14-га верасьня раніцай рабоча-сялянская дэлегацыя Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі вярнулася ў Менск, пасьля паездкі па гарадох БССР.

Дэлегацыя падзялілася на дзьве групы, якія ў працягу трох дзён наведалі Віцебск, Барысаў, выяжджалі ў раёны Барысаўшчыны і апрача таго былі ў Койданаве.

Пасьля прыезду ў Менск дэлегацыя працягвала азнаямленьне з працай савецкіх і прафэсыянальных устаноў і арганізацый БССР.

Раніцай дэлегацыя ў поўным складзе наведала ЦВК, дзе была прынята старшынёю ЦВК БССР тав. **А. Г. Чарвяковым.**

У габінэце тав. Чарвякова адбылася таварыская гутарка.

Сваю гутарку тав. Чарвякоў пачаў з азнаямленьня дэлегацыі з канстытуцыйным ладам СССР.

Значная частка гутаркі тав. Чарвякова была прысьвечана гаспадарчаму і культурнаму будаўніцтву Савецкай Беларусі. Шэрагам цікавых прыкладаў ён даў малюнак грандыёзнага будаўніцтва, якое разгарнулася ў БССР за апошнія гады.

Беларусь—краіна балот. Рабоча-сялянскі ўрад знайшоў магчымасьць гэтыя балоты ператварыць у квяцістыя палі. Найбольш буйныя мэліярацыйныя работы разгарнуліся на Мар'інскім балотным масыве. Тэмп работ аўдзівіў нават нямецкіх інжынэраў, якія наведалі гэты масыў.

У Беларусі на дзяржаўныя сродкі асушаецца 50.000 гэктр. балот, не гаворачы ўжо аб сотнях сялянскіх мэліярацыйных таварыстваў, якім дзяржава аказвае дапамогу.

Ня менш падрабязна тав. **Чарвякоў** у часе гутаркі спыніўся на дасягненьнях у галіне культурнага будаўніцтва і нацыянальнай палітыкі савецкай улады. У БССР распачата надзвычайна вялікая праца па ўвядзеньні ўсеагульнага навучаньня. На гэтую справу ўсяго патрабуецца каля 100 мільёнаў рублёў. Саюзны ўрад аказвае нам у гэтай справе вялікае падтрыманьне. У шэрагу гарадоў Беларусі ўсеагульнае навучаньне ўжо ўведзена і праводзіцца в вялікім посьпехам.

З надзвычайнай увагай слухалі дэлегаты тую частку гутаркі, дзе тав. Чарвякоў закранаў посьпехі Савецкай Беларусі ў вырашэньні нацыянальнага пытаньня. Кожны адказны працаўнік у БССР павінен ведаць ня менш трох моў, каб лепш абслугоўваць працоўнае насельніцтва. Для абслугоўваньня нацменасьцяй у нас утвораны нацыянальныя сельсаветы, школы, лік якіх павялічваецца з кожным годам, выдаюцца газэты, часопісі, літаратура на беларускай, расійскай, польскай, яўрэйскай, літоўскай, латыскай мовах.

«Думка аб тым, кажа тав. Чарвякоў, што Савецкі Саюз зьяўляецца бацькаўшчынай усіх працоўных усіх нацыянальнасьцяй, усё глыбей і глыбей прасякае ў сьвядомасьць працоўных мас».

Дэлегаты задалі тав Чарвякову шмат пытаньняў, на якія атрымалі падрабязныя адказы. Дэлегаты цікавіліся гандлёвай палітыкай савецкага ўраду і г. д.

У сваю чаргу дэлегатам быў заданы шэраг пытаньняў—аб уражаньнях ад паездкі па БССР, аб недахопах, якія яны заўважылі. Былі пытаньні і аб становішчы працоўных жанчын у Польшчы і інш.

На запытаньні адказвалі т. т. **Мац, Бэм** і інш.

«Калі мы выяжджалі ў БССР, гаварылі дэлегаты, мы мелі на ўвазе ў першую чаргу пазнаёміцца з тым, як у Савецкай Беларусі вырашана нацыянальнае пытаньне. Мы ўпэўніліся ў тым, **што нацыянальная палітыка, якая праводзіцца савецкай уладай, самая правільная.**

Вы нас пытаеце, якія недахопы заўважылі мы ў часе паездкі, але нас так захапіла вашае будаўніцтва, што мы нават не маглі заўважыць іх. Нам там у Польшчы, гаварылі, што мы ў СССР убачым зруйнаваныя фабрыкі і абадраныя рабочых. Гэта—плёткі, якія могуць выдумаць толькі ворагі рабочае клясы. Наадварот, на кожным кроку тут мы бачылі новыя заводы, фабрыкі, электрастанцыі, школы, унівэрсытэты.

Якая вялікая розьніца паміж становішчам жанчыны ў Польшчы і ў СССР! Мы бачылі жанчын на розных пасадах: жанчына-кандуктар, лістаносец, чырвоны дырэктар; абслугоўваньне працоўных жанчын у Савецкай Рэспубліцы надзвычайна добрае. Мы бачылі і наведалі дзесяткі дзіцячых садоў, кансультацый, ясьляў.

У СССР актыўны рабочы на прадпрыемстве можа быць в супуты на адказную работу, а ў нас больш актыўных рабочых імкнуцца выкінуць з прадпрыемства, бо яны становяцца небясьпечнымі.

Усіх дасягненьняў, якія бачылі тут, не пералічыць, але галоўных абыйсьці нельга. Вялікім дасягненьнем зьяўляецца працоўнае заканадаўства, асабліва ў галіне сацыяльнага страхаваньня. У СССР ажыцьцяўляецца 7-гадзінны рабочы дзень, у той час, як у Польшчы працуюць па 12-13 гадзін у дзень.

Гутарка з тав. **Чарвяковым** працягвалася каля 5 гадзін. З ЦВК дэлегаты накіраваліся ў розныя наркаматы.

***

Сёньня а 12-й гадзіне дня ў Доме Культуры адбудуцца ўрачыстыя провады дэлегацыі, якая вечарам выедзе з Менску.

Аўстрыйскія рабочыя энэргічна змагаюцца с фашызмам

ВЕНА, 13. Адбыўшаяся ў Вене канфэрэнцыя заўкомаў бастуючых гарбарных заводаў аднагалосна адхіліла ультыматум прадпрыемцаў, якія прапанавалі аднавіць работу пад пагрозай лёкаўту. Пастаноўлена працягваць забастоўку. Адміністрацыя некаторых гарбарных заводаў каля Вены запрасіла штрэйкбрэхэраў з ліку членаў хэймвэра, якія прыступілі да работы пад аховай жандармэрыі.

На адным заводзе ў Ніжняй Аўстрыі членам хэймвэру ўдалося перапакодзіць забастоўцы. Аднак, забастоўка ўсё разрастаецца. У сучасны момант бастуе ўжо 2.500 чалавек.

Камуністычная «Ротэ Фана» падкрэсьлівае, што забастоўка гарбароў, якая набыла палітычны характар, зьяўляецца важным зьвяном у ланцугу апошніх эканамічных забастовак. Газэта заклікае рабочых абіраць рэвалюцыйныя забастовачныя камітэты і фармаваць атрады самаабароны супроць фашыстых. (ТАСС).

Хэймвэр фармуе чыгуначную арганізацыю з фашыстых

ВЕНА, 13. Усеаўстрыйскае камандаваньне хэймвэру рашыла сфармаваць спэцыяльную чыгуначную арганізацыю на строга ваенных пачатках для аб'яднаньня неарганізаваных чыгуначнікаў, якія спачуваюць фашызму. (ТАСС).

Адкрыты новы багаты нафтаю пласт

ГРОЗНЫ, 13. На новых промыслах в прабоіны № 4, на вучастку № 28, пачаў біць магутны нафтавы фантан, вышынёй у 25 мэтраў. Геалёгі лічаць, што фантан б'е з вельмі багатага новаадкрытага нафтавага пласту.

Гаспадары Лігі Нацый бароняць свае інтарэсы

КІТАЙСКАЯ ПРАПАНОВА АСУДЖАНА НА НЯЎДАЧУ

ПАРЫЖ, 13. «Тан», закранаючы спрэчкі на пленуме Лігі Нацый у Жэневе, піша:

«Трэба канстатаваць, што ў дэлегатаў, якія прадстаўляюць на пленуме пераможаныя краіны, ёсьць задняя думка аб тым, што палітыка міру павінна прывесьці да вызваленьня пераможных краін ад ланцугоў, якія ўскладзены мірнымі дагаворамі, а таксама да такога перабудаваньня пасьляваеннага становішча ў Эўропе, пры якім ня было-б ні пераможцаў ні пераможаных. У гэтых адносінах вельмі характэрна выступленьне кітайскага дэлегата адносна 19-га артыкулу статуту Лігі Нацый.

Кітайская прапанова нікога не ўвядзе ў ману. Пытаньне аб пераглядзе дагавароў ня можа ўзьнікнуць ні ў Жэневе, ні ў другім месцы, і няма такіх абходных манэўраў, якія штурхнулі-б Лігу Нацый на такі небясьпечны для ўсяе палітыкі сьвету—шлях. Уступленьне на гэты шлях азначала-б адмову Лігі Нацый ад сваёй сапраўднай місіі і падрыхтоўку ёю сваёй уласнай пагібелі, бо «існуючыя дагавары ствараюць фундамант міру». Мірная палітыка можа разьвівацца толькі ў рамках гэтых дагавароў, і тол

ВЫШЭЙ СЬЦЯГ БАЛЬШАВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКІ

На аснове пралетарскай самакрытыкі павядзем бязьлітасную барацьбу з апартуністычнымі хістаньнямі ў нашых радох, з правым ухілам у практычнай рабоце, з бюракратызмам і загніваньнем у асобных зьвеньнях

Рашучая барацьба з „верхаглядзтвам", штэмпэляваньнем, якімі часамі асобныя парторганы падменьваюць глыбокую прапрацоўку важных палітычна-прынцыповых пытаньняў

Выкрыем глушыцеляў самакрытыкі, усіх тых, хто абразвае ініцыятыву пралетарскіх мас

Выжыць з практыкі партработы штампаваньне „Верхаглядзтва"

Бабруйскі гарком КП(б)Б дае ўзор, як ня трэба абсьледаваць і кіраваць

Аб «верхаглядзкіх» абсьледваньнях і іх сумных выніках пісалася і гаварылася ня мала. Але далёка ня ўсім гэтка дало карысьць. Некаторыя партарганізацыі, у прыватнасьці Бабруйскі гарком КП(б)Б, ня здолеў з гэтага зрабіць адпаведных вынікаў. І больш таго, ён нават з прыкладаў сваёй арганізацыі (справа камбінату) ня мог вынесьці для сябе пэўнага ўроку.

Перад намі вывады абсьледваньня ячэйкі КП(б)Б зав. «Адзярыха», складзеныя двума членамі бюро і зацьверджаныя гаркомам. Чытаеш гэтыя «вывады» і думаеш: складалі іх людзі, якія пастаўлены для кіраўніцтва арганізацыяй ці нэйтральныя, палітычна сьляпыя наглядчыкі? У гэтых вывадах не знайсьці ніводнай выразнай ацэнкі становішча ячэйкі і яе работы, у іх толькі павярхоўна, у агульных рысах канстатуюцца асобныя моманты, па якіх нельга ацаніць інакш гэтыя вывады, як вусім шкодным дакумантам для справы сапраўднага паляпшэньня партработы.

Вось як характарызуюць «вывады» становішча на заводзе і ў ячэйцы:

«Больш 50 проц. рабочых на вытворчасьці нядаўна, значная частка іх выхадцы з дробнай буржуазіі, былыя гандляры, балаголы (рамізьнікі), якія шчыльна зьвязаны з дробна-буржуазным асяродзішчам. Частка іх зьяўляюцца членамі партыі і ўносяць у ячэйку абываталься-мяшчанскія настроі. На гэтай глебе ў ячэйцы — доўгадовая сыстэматычная склока, якая адрывае ячэйку ад асноўнай гаспадарчай і палітычнай працы. Дысцыпліна ў ячэйцы адсутнічае. З 13 членаў ячэйкі частка зусім ня ўцягнута ў партыйна-грамадзкую працу. Некаторыя партыйцы зусім разлажыліся».

Як-жа ячэйка змагалася з гэтымі хваравітымі зьявішчамі, як пастаўлена партыйна-выхаўчая работа. Аб гэтым у «вывадах» няма ні слова. Затое ў іх вы знойдзеце вось такую ацэнку:

«Аўтарытэт ячэйкі мае вельмі слабы, але ўсё-ж такі знаходзіцца на вышыні свайго палажэньня».

Ідэалёгічнае становішча ячэйкі характарызуецца аднэй толькі фразай: «Ідэалёгічная ўстойлівасьць асобных членаў партыі слабая».

Ну, а ячэйка цалкам? Як яна вяла і вядзе барацьбу супроць ухілаў ад лініі партыі? Як прапрацавана і ўсьвядомлена партыйцамі сутнасьць і небясьпека правага ўхілу і прымірэнцтва? Ці мабілізавана ячэйка для адпору канкрэтным праявам правага ўхілу і хістаньням паасобных членаў ячэйкі. Аб усім гэтым зноў такі ў «вывадах» ніводнага слова.

Уся работа ячэйкі, яе кіраўніцтва вытворчым жыцьцём прадпрыемства характарызуецца парай агульных фраз: «Вытворчая дысцыпліна здавальняючая»... «выконваюцца ўсе масавыя кампаніі і заданьні ўраду».

Супакоіўшы сябе і ячэйку, што «ўсё [illegible]», «абсьледвацелі» далей адзначаюць ячэйцы і сярод рабочых не прапрацаваны важнейшыя пытаньні, як, напр., пастановы XVI партканфэрэнцыі, аб чыстцы партыі і сав. апарату; наглядаюцца прагулы, спазьненьне на працу, сымуляцыя на вытворчасьці, кепскія паводзіны партыйцаў на вытворчасьці, мала праводзіцца вытворчых нарад, пасяджэньняў вытворчых камісій, агульных сходаў рабочых; не разгорнута грамадзкая і культмасавая работа; зусім не працуюць гурткі; не праводзіцца работа на інтэрнацыянальным выхаваньні; не праводзіцца ніякае работы з беспартыйным актывам. Ячэйка з 1927 году не расла, партыйцы страцілі пэрспэктыву росту, яны гавораць: «Няма за кошт каго расьці».

Усё гэта ў вывадах адзначаецца **толькі** як «недахопы». Што-ж, урэшце, адпак, застаецца ад усёй працы ячэйкі? У чым-жа канкрэтна выказваецца кіраўніцтва ячэйкі? Гэта, як відаць, вядома толькі «абсьледвацелям» з Бабруйскага гаркому.

Ніякага аналізу прычын такога становішча ячэйкі, ніякіх вываадаў гарком ня робіць, якія-б завастрылі ўвагу ячэйкі на асноўных пытаньнях.

Ці варта пасьля гэтага дзівіцца, што замест вызначаных канкрэтных мерапрыемстваў па аздараўленьні і ўзмацненьні ячэйкі, Бабруйскі гарком абмежаваўся толькі тым, што даў агульныя дырэктывы, у якіх можна знайсьці ўсё, што хочаце, але ніводнага слова ня знойдзеце аб барацьбе з правым ухілам і прымірэнцтвам, аб сацыялістычным спаборніцтве і інш. важнейшых пытаньнях.

Замест практычных указаньняў гарком дае ячэйцы такія дырэктывы: «Разгарнуць шырэй крытыку і самакрытыку», «шырэй разгарнуць працу па чыстцы партыі і сав. апарату», «разгарнуць агульна-адукацыйную працу», «шырэй разгарнуць антырэлігійную працу і інтэрнацыянальнае выхаваньне», «разгарнуць працу шэфтаварыства, вайсковую працу» і г. д.

Як бачыце, усе дырэктывы па адным штампе. Замест таго, каб завастрыць увагу ячэйкі на вузлавых, канкрэтных для яе пытаньнях, ёй прапануюць **«разгарнуць»** усе галіны працы, не паказваючы пры гэтым канкрэтна, як гэта зрабіць.

Гарком нават не падумаў, ці зможа ячэйка без канкрэтнай дапамогі справіцца з выкананьнем гэтых дырэктыў.

Замест таго, каб вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па аздараўленьні ячэйкі, гарком абмяжоўваецца агульнай дырэктывай «весьці рашучую барацьбу са склокай, падхалімствам і г. д.».

Праўда, райком выключыў з партыі аднаго члена ячэйкі, які канчаткова разлажыўся, але тут-жа сваёй пастановай аб другім партыйцы з гэтай-жа ячэйкі даў наглядны ўзор няправільнага падыходу да барацьбы з хваравітымі зьявішчамі.

Трэба рашуча ўдарыць па «верхаглядзтве» — вось асноўны вывад, які сам напрашваецца з вышэйпаданага.

Апошні пленум ЦК КП(б)Б асабліва завастрае пытаньне партарганізацый на патрэбнасьць рашучага паляпшэньня якасных паказальнікаў партыйнай работы. Пленум падкрэсьліў, што «верхаглядзтва», штамп, фармальнае кіраўніцтва гэта зараз найвялікшае зло ў партработе. Яны пазбаўляюць магчымасьці своячасова і правільна выначыць тыя пункты, якія зьяўляюцца вузлавымі для таго ці іншага канкрэтнага вучастку нашага будаўніцтва, за якія патрэбна своячасова ўчапіцца, каб пацягнуць увесь ланцуг. Яны перашкаджаюць своячасовай мабілізацыі шырокіх партыйных і рабочых мас для рашучай барацьбы з усімі недахватамі нашай працы, вядуць да недаацэнкі недахватаў, да іх замазваньня, да прымірэнцтва. Трэба добра ўявіць сабе, што там, дзе пануе «верхаглядзтва», там няма і ня можа быць разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі, там лёгка захварэць на палітычную сьлепату, там нямінуча скочваюцца ў апартуністычнае балота і ствараюцца ўмовы для ўзмацненьня пазыцый клясавага ворага.

Ш. Г.

Ганебныя зьдзекі з самакрытыкі ў ячэйцы Наркамюсту

З кожным днём усё больш і больш разгортваецца самакрытыка і крытыка. Аднак, у гэтым няма нічога новага, некаторыя таварышы імкнуцца задушыць самакрытыку. Мы тут маем на ўвазе партыйцаў і кіраўнікоў ячэйкі Наркамюсту, бо факты з жыцьця партыйнай ячэйкі НКЮ БССР гавораць за тое, што ячэйка ня зусім добра зразумела задачы самакрытыкі і не заўсёды давала адпор тым сваім членам, якія яўна перашкаджалі разгортваньню самакрытыкі.

У ячэйцы НКЮ самакрытыку прабуюць абмежаваць, увесьці яе ў якія-небудзь пэўныя рамкі накшталт тэорыі: «Трэба ведаць дзе, як і аб кім гаварыць». Часта правільнае і адкрытае выступленьне супроць скажэньняў у рабоце апарату кваліфікавалася, як дэмагогія і бузацёрства. Нам здаецца, што сакратар парт'ячэйкі Наркамюсту належыць да гэтага тыпу глушыцеляў самакрытыкі.

Факт, які меў месца ў Наркамюсьце ў часе чысткі апарату, зьяўляецца яскравым прыкладам зажыму самакрытыкі.

Чыстка апарату Наркамюсту праходзіла «актыўна». Адзін супрацоўнік хваліў другога: «вытрыманы», «энэргічны», «адданы справе» і г. д. Замест канкрэтных фактаў аб рабоце апарату, замест выступленьняў аб тым, як Наркамюст праводзіць клясавую лінію, як вядзецца барацьба з бюракратызмам і цыганінай, як праводзіцца рацыяналізацыя і абслугоўваньне наведвальнікаў — усе выступленьні складаліся з гучных кампліментаў і агульных разважаньняў. Трэба адзначыць, што большая частка прамоўцаў хваліла адзін другога і зусім малая частка выступала з крытычнымі заявамі. Пры абгаварэньні працы намесьніка наркома т. **Гофмана** таксама было вельмі мала крытычных выступленьняў.

Зноў ліліся пахвалы і кампліменты, зноў гучэлі прыгожыя фразы. Таму ня дзіва, што выступленьне т. **Сільнікава** з рэзкай і сьмелай крытыкай апарату Наркамюсту было тут нячуванай справай. Тав. Сільнікаў — рабочы вылучэнец, актывісты-партыец, выступіў па сутнасьці справы і падаў цэлы рад прыкладаў невыстарчальнай работы апарату органаў юстыцыі. Ён гаварыў не аб якасьцях т. Гофмана, як чалавека, а аб рабоце апарату, якім т. Гофман кіруе. Тав. Сільнікаў, як нізавы акруговы работнік, крытыкаваў гэты апарат, чым па сутнасьці рабіў вялікую справу. Старшыня камісіі па чыстцы т. **Шукевіч-Трацьцякоў** чамусьці не даваў гаварыць прамоўцы, спыняў яго і ўрэшце, па невядомых для нас прычынах пазбавіў яго зусім права гаварыць. Цалкам правільнае крытычнае выступленьне тав. Сільнікава т. Шукевіч лічыў «не па сутнасьці пытаньня». Тав. Сільнікаў, ведаючы сваё права на крытыку, ня спыняўся і працягваў сваё выступленьне, — аднак, яму не далі скончыць сваё слова.

Зноў паліліся пахвалы і выступленьні нібы «па сутнасьці».

Нарэшце, чыстка была скончана. І тады **сакратар парт'ячэйкі т. Нароенка** абвяшчае адкрытым агульны сход калектыву НКЮ, на якім ён ставіць пытаньне аб выступленьні т. Сільнікава.

Сакратар кваліфікаваў выступленьне тав. Сільнікава, як бузацёрства і нявытрыманасьць. Па прыкладзе сакратара парт'ячэйкі частка супрацоўнікаў выступала в такімі-ж абвінавачаньнямі супроць Сільнікава і з шчырымі спачуваньнямі пакрыўджанаму начальству. **Пад націскам сакратара ячэйкі т. Сільнікаў,** вылучэнец і камуністы, **за сваё выступленьне на чыстцы атрымаў ганьбаваньне.** На гэтым сакратар **Нароенка** не здаволіўся. Яму было мала, што тав. Сільнікаву за здаровую і правільную самакрытыку вынесьлі ганьбаваньне, Нароенка падазваў да сябе т. Сільнікава і загадаў:

— А ну-ка дыхні!

Зусім зразумела, што гэтым сакратар хацеў давесьці, што тав. Сільнікаў выступаў, будучы п'яным. Нічога і з гэтага ня вышла. Усе ведаюць, што тав. Сільнікаў вытрыманы камуністы, які ніколі п'янствам не займаецца. Пасьля гэтых ганебных зьявішч з жыцьця ячэйкі НКЮ застаецца запытаць:

— Дзе-ж былі партыйцы ячэйкі, дзе былі адказныя работнікі - партыйцы?

Ці існуе наогул самакрытыка ў ячэйцы?

Ці няма заложаных у самой працы ячэйкі больш глыбокіх прычын, якія дазволілі сакратару ячэйкі так нагла і адкрыта апальваць самакрытыку.

РАДНЯК.

Сакратар райкому ў ролі глушыцеля самакрытыкі

(Менская акруга).

Мэтады партыйнага кіраўніцтва **Узьдзенскага райкому КП(б)Б** ні ў якай меры не адпавядаюць агульна-партыйнаму курсу на шырокае разгортваньне ўнутры партыйнай дэмакратыі і пралетарскай самакрытыкі.

У рабоце і кіраўніцтве арганізацыі з боку сакратара райкому тав. **Фахэнгауза** наглядалася камандаваньне, зажым сама крытыкі і замазваньне недахопаў у арганізацыі. Па адрасе тых партыйцаў, якія прабавалі крытыкаваць, з боку сакратара райкому чуліся выкрыкі. Падамо некалькі фактаў. Райком падводзіў вынікі работы па калектывізацыі сельскае гаспадаркі, у гэтых выніках даецца ацэнка, што «работа па калектывізацыі была здавальняючай». А пра тое, што з боку шмат якіх камуністых **з раённай арганізацыі назіралася супраціўленьне калектывізацыі, пра тое, што ў гэтым пытаньні выявіліся яўныя факты правага ўхілу, — пра гэта райком нічога не сказаў.**

Праверку работы ячэек тав. Фахэнгауз не даваў **ні аднаму з членаў бюро райкому.** І таму гэту работу ён праводзіў сам асабіста.

Вынікаў свае работы па аглядзе ячэек ён ніколі на бюро ня ставіў, абмяжоўваўся толькі тым, што ячэйкам даваў «наганяй». **Гэткае становішча давяло да замазваньня калектыўнага кіраўніцтва райкому партыйнай арганізацыяй.** Калектыўнага кіраўніцтва ня было, партактыў не скарыстоўваўся і нават у шмат якіх выпадках ігнараваўся сакратаром райкому.

Такія мэтады кіраўніцтва, факты парушэньня ўнутры-партыйнай дэмакратыі, замазваньне недахопаў у данай райпартарганізацыі ўжываліся толькі таму, што там **ня было сапраўднага разгортваньня шырокай масавай самакрытыкі.** Калі на апошняй райпартканфэрэнцыі некалькі таварышоў пачалі паказваць на недахопы ў рабоце райкому, дык **сакратар РК сваім выступленьнем прыдушыў іх ініцыятыву да разгортваньня самакрытыкі.** Гэты факт выклікаў вялікае абурэньне з боку партыйных мас.

Менскі акруговы нядаўна абсьледваў работу Узьдзенскай арганізацыі ў галіне разгортваньня самакрытыкі і кіраўніцтва савецкім апаратам. У сувязі з выяўленымі фактамі зажыму самакрытыкі, дрэннага кіраўніцтва савецкім і каапэрацыйным апаратам, бюро акругкому пастанавіла склікаць па-за чарговы пленум райкому, на якім паставіць даклад прадстаўніка бюро акругкому аб становішчы і далейшых задачах Узьдзенскай партарганізацыі.

Я. І—н.

Сход актыву Фрунзаўскай арганізацыі КП(б)Б

Учора ў клюбе імя Карла Маркса адбыўся сход актыву Фрунзаўскай раённай арганізацыі КП(б)Б. На сходзе прысутнічала каля 1.000 чалавек.

Сход заслухаў даклад тав. **Гурэвіча** аб канкрэтных праявах правага ўхілу ў раённай партарганізацыі.

У спрэчках па дакладу выступілі т. т. **Лебедзева, Карачун, Эльлянаў, Шмідт, Зарэцкі, Хініч, Сандлер, Баліцкі, Хлеўнікаў і Пяцірэнка.**

З прычыны позьняга часу працяг сходу актыву перанесены на 17-га верасьня.

Што-ж рабіла парт'ячэйка

Рабочых за самакрытыку звальнялі з работы, глушылі ініцыятыву рабочых, а парт'ячэйка ганебна маўчала

(Ячэйка КП(б)Б будаўнікоў, Магілеў)

На адным з адкрытых сходаў ячэйкі КП(б)Б будаўнікоў загадчык працкалектыву **Іофе** зрабіў даклад аб становішчы працкалектыву. Дакладчык свой даклад пабудаваў так, што з яго нельга было вынесьці прадстаўленьня аб тым, у якім-жа становішчы знаходзіцца працкалектыў. Пасьля дакладу пасыпаліся сотні актуальных пытаньняў: аб канфліктах, аб сацыялістычным спаборніцтве, аб вытворчых нарадах, аб звальненьні рабочых бяз згоды РКК і фабзаўкому і інш.

Дакладчык супакойваў рабочых, што на фабрыцы ўсё ціха, усё добра і спакойна, гаварыў, што няма чаго турбавацца. Але **18 рабочых,** якія выступілі ў спрэчках, гаварылі аб адваротным, яны на фактах даводзілі, што ня ўсё добра і ціха ў працкалектыве. Са спрэчак выявілася, што з боку адміністрацыі няма чуласьці да прапаноў рабочых, што адміністрацыя адарвана ад рабочых, назіраюцца выпадкі грубасьці. На законныя патрабаваньні рабочых, на крытыку рабочых дзеяньняў адміністрацыі, апошняя адказвала звальненьнем рабочых з работы (выпадкі з работніцай Хруцкай і рабочым Фабушам). Рабочы Зысман у сваім выступленьні паказаў на тое, што рабочыя баяцца выступаць з крытыкай адміністрацыі.

З раду выступленьняў выявілася, што на прадпрыемстве адсутнічае працдысцыпліна, прагулы дасягаюць 90 чалавека-дзён у месяц. Адміністрацыя і фабзаўком грызуцца паміж сабою, а гэта грызьня адбіваецца на рабоце прадпрыемства. Чым-жа вытлумачыць тое, што да гэтага часу на прадпрыемстве рабочыя нічога ня ведаюць аб сацыялістычным спаборніцтве, як ня грызьнёй начальства? Мерапрыемствы, якія праводзяцца ў працкалектыве, ніколі не абгаворваюцца на шырокіх рабочых сходах, а выплываюць з габінэту загадчыка і гэта выклікае нездавальненьне сярод рабочых.

Напрыклад, расцэнкі выпрацоўваліся адным загадчыкам, рабочыя аб іх нічога ня ведалі. Партыйная ячэйка будаўнікоў аб усім гэтым ведала, але маўчала. Ячэйка ня цікавілася і не хацела цікавіць жыцьцём рабочых працкалектыву, ня гледзячы на тое, што камсамольцы, якія працуюць у працкалектыве, ня раз інфармавалі яе аб становішчы працкалектыву.

Ячэйка КП(б)Б будаўнікоў павінна зараз-жа ўзяцца за работу па кіраўніцтве працкалектывам па разгортваньні там самакрытыкі. Райком партыі павінен зацікавіцца работай гэтай ячэйкі.

ПАДАРОЖНЫ.

Пленум Мен. АКК КП(б)Б аб чыстцы савецкага апарату

Чыстка савецкага апарату ў акрузе праходзіць бяз удзелу ў ёй мас

Пленум Мен. АКК, які працаваў з 7 па 9 верасьня, побач з другімі пытаньнямі абмеркаваў даклад т. **Леванчука** аб чыстцы савецкага апарту. Дакладчык і ўдзельнікі пленуму аднадушна прыйшлі да вываду, што на гэтым важнейшым вучастку работы ёсьць сур'ёзныя і небясьпечныя прарывы.

Адказьнейшая палітычная задача ня выканана — чыстка савецкага апарату праходзіць слаба. Бяздзейнасьць прафсаюзаў, пасыўнасьць партыйных і камсамольскіх арганізацый прывялі да таго, што чыстка апарату праходзіць замкнута, бя удзелу мас.

Выступленьне т. **Кананава** яскрава ахарактарызавала тое катастрафічнае становішча, у якім зараз знаходзіцца работа па чыстцы апарату.

— Дырэктывы аб чыстцы савецкага апарату мы ня выканалі. Нашы партыйныя, прафсаюзныя і савецкія арганізацыі не зрабілі належных захадаў да рашучага паляпшэньня гэтае работы, не зрабілі таго, што трэба было зрабіць. Раёны таксама не падрыхтаваны. Работа па чыстцы апарату знаходзіцца ў такім становішчы ня толькі ў Менскай акрузе, а і наогул па ўсіх округах БССР. Трэба дабіцца пералому. Трэба ўдарыць па наплявацельскіх недапушчальных адносінах да правядзеньня важнейшай палітычнай работы. Мы павінны скарыстаць вопыт і практыку **Маскоўскай** арганізацыі, якая перанесла чыстку на фабрыкі і заводы. Тав. **Судакоў** зусім правільна адзначыў, што работа па чыстцы апарату праходзіла і праходзіць няплянава.

Частка віны за невыстарчальнае правядзеньне чысткі апарату ляжыць бязумоўна і на акруговай РСІ. РСІ, правёўшы відавочную работу па арганізацыі рабочых брыгад, не замацавалі дасягнутых посьпехаў. Больш паловы рабочых брыгад ня ўдзельнічалі ў практычнай рабоце. РСІ не правяра работу брыгад. Тав. **Дамброўскі** правільна адзначыў, што прэзыдыум АКК не зрабіў усіх захадаў да рашучага паляпшэньня работы па чыстцы акруговага апарату.

Пленум АКК, падагульваючы ўсе гэтыя факты, даў ім палітычную ацэнку. Ва ўхваленай рэзалюцыі гаворыцца, што:

— На падставе практыкі праведзенай чысткі некаторых гарадзкіх устаноў і Пухавіцкага раёну, а таксама правядзеньня падрыхтоўчай работы як у горадзе, так і па раёнах, пленум Мен. АКК КП(б)Б лічыць, што праведзеная работа па падрыхтоўцы да чысткі апарату і барацьбе за яго паляпшэньне прайшла і праходзіць нездавальняюча як з боку самой РСІ, так і з боку партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый, што стварае вялікую небясьпеку за пасьпяховае правядзеньне гэтае важнае палітычнае кампаніі, як аднэй з форм клясавае барацьбы.

Прынятыя пленумам пастановы па паляпшэньні падрыхтоўчай работы і самой чысткі поўнасьцю забясьпечваюць пасьпяховае правядзеньне чысткі савецкага апарату. Зразумела, што гэта магчыма толькі тады, калі пастановы пленуму будуць цалкам праведзены ў жыцьцё.

УЗМАЦНЕНЬНЕ ТЭМПУ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ--УДАР ПА КЛЯСАВАМУ ВОРАГУ

Ня ўсе прадпрыемствы і ўстановы зразумелі важнасьць беларусізацыі

Нашыя рабкоры сыгнапізуюць аб нядбайных і бюракратычных адносінах да практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў па нацпытаньні

Патрэбен пералом

Апарат ВСНГБ з 15-га ліпеня 1927 году афіцыйна «працуе» на беларускай мове: усё дзелаводзтва пераведзена на беларускую мову. Але ў службовыя гадзіны карыстаюцца беларускай мовай лічаныя асобы: дзеловоды і адна-дзьве машыністкі. У 1927 г. пры праверцы ведаў па беларусазнаўстве нацкамісіяй амаль усе спэцыялістыя (інжынэры і бухгальтары - эканамістыя) атрымалі ад Наркамасьветы пасьведчаньні аб пасьпяховым вывучэньні белмовы, але частка спэцыялістых, што трымаюць у сваёй кішэні гэтыя пасьведчаньні, ня усвоіла атрыманыя веды і пры ўсялякай магчымасьці стараецца «сьпіхнуць» паперку на расійскай мове. Гутаркі на беларускай мове сярод спэцаў не пачуеш, хаця сярод іх ёсьць людзі, якія нават і вусім нядрэнна гаворань пабеларуску і якія нават часта і ўжываюць белмову, але ўсё гэта робіцца з напружанасьцю, з такой, так сказаць, «параднасьцю».

Пасяджэньні прэзыдыуму ВСНГ адзначаюцца сваёй беларусізацыяй толькі тым, што пратаколы пішуцца на белмове, спрэчкі-ж і ўсё абгаварэньне вядзецца на расійскай мове.

Добра ведаюць белмову і свабодна ёю карыстаюцца адказны сакратар ВСНГ тав. Лучышын і сакратар бюро парт'ячэйкі т. Гольдбэрг, але іх уплываў на калектыў служачых па ўжываньні белмовы ня відаць. Таксама не заўважваецца ўплыву ў сэнсе большага ўкараненьня сярод супрацоўнікаў беларусізацыі і в боку мясцкому.

Па адміністрацыйнай лініі прэзыдыум некалькі раз зварачаўся да калектыву і з просьбай, і з прапановамі аб патрэбнасьці поўнага ажыцьцяўленьня ва ўстанове беларусізацыі, ёсьць нават і некалькі вымоў супрацоўнікам за нявыкананьне дырэктывы аб беларусізацыі, але пакуль што сапраўдных станоўчых вынікаў ад гэтых мерапрыемстваў няма.

З.

МОНІЧ

Толькі два чалавекі

У шавецкай майстэрні Гандальбуду белмову ўжываюць толькі два чалавекі: сакратар ячэйкі КП(б)Б і адзін камсамолец.

Пытаньне гэта некалькі раз ужо абмяркоўвалася на розных сходах, выносіліся добрыя пастановы, але ўсе гэтыя пастановы прайшлі міма вушэй. Ёсьць нават тарашы, якія ведаюць белмову, але лічаць непатрэбным яе ўжываць.

СВОЙ.

Для адводу вачэй

У нас на менскім «Эльводзе», з беларусізацыяй вельмі слаба. Праўда, у канцылярыі розныя паперкі пішуцца на белмове, але гэта толькі для адводу вачэй. У жыцьці белмова нікім ня ўжываецца.

Учора вывешана абвестка аб арганізацыі гуртка па вывучэньні белмовы. І за гэта дзякуй!

Рабочы БЯЗРОДНЫ.

Беларусізацыя—на паперы

На пабудове Дому Ўраду ўжо працуе каля 90 рабочых, з іх чалавек 40 сэзоньнікаў-беларусоў. Ніякай культурнай работы сярод іх пакуль што не вядзецца, хаця работа пачалася ў маі месяцы.

Цікава адзначыць, як абслугоўваючы пэрсанал разумее беларусізацыю апарату. Кантора Белдзяржбуду ўсё дзелаводзтва пераявяла на белмову. Усе паперкі пішуцца на белмове, але з рабочымі беларусамі-сэзоньнікамі працаўнікі канторы гутараць на расійскай мове. Паміж сабой працаўнікі канторы таксама гавораць на расійскай мове.

Так разумеюць нашы служачыя беларусізацыю.

Рабочы Г.

Топчамся на адным месцы

(Сьпірта-гарэлачны завод)

Ужо два гады, як мы вывучаем белмову, але далёка не заехалі. Кожную зіму з кастрычніка месяца пачынае працаваць беларускі гурток (гэта ўжо ўвайшло ў традыцыю) і кожны раз пачынае з таго самага і вывучае тое самае, што і раней. Карацей кажучы, ніякага вучоту работы не вядзецца. Пройдзенае не замацоўваецца, **праверкі ведаў пры роспуску** гуртка на лета ня робіцца. Самыя заняткі вядуцца так, што яны ня цікавяць наведвальнікаў. Разьбіраюць і чытаюць артыкулы і апавяданьні, напісаныя для малых дзяцей, далёкія і ад вытворчасьці, і ад сацыялістычнага будаўніцтва, і канторскай тэрміналёгіі.

А ў выніку...

Замест 20 чалавек, што запісаліся, гурток наведваюць 4-5 чалавекі. Характэрна і яшчэ адно, што ў нашым беларускім гуртку займалася толькі **адна работніца,** а ўсе іншыя служачыя канторы. Гэта сьведчыць аб тым, што **заўком не ўдзяліў належнае ўвагі пытаньню беларусізацыі, не растлумачыў рабочым яе значэньня і патрэбнасьці.**

У гэтым годзе ў нас таксама арганізуецца беларускі гурток і, каб ён мог пасьпяхова працаваць, лічу патрэбным:

Стварыць шырокую грамадзкую думку наўкола пытаньня беларусізацыі, завастрыўшы на гэтым максымум увагі.

Так пабудаваць праграму заняткаў, каб яны маглі зацікавіць слухачоў. Чытаць і разьбіраць артыкулы блізкія слухачом, прыстасаваныя да характару вытворчасьці таго ці іншага прадпрыемства, да апаратнай работы тэй ці іншай установы.

На пасяджэньнях заўкому культкамісіі заслухоўваюць справаздачы старшыні гуртка аб ходзе вучобы.

Высьвятляць прычыны і рэагаваць на ненавядваньне гуртка паасобнымі таварышамі.

Ужываць беларускую мову ў штодзённай рабоце ячэйкі і заўкому ня толькі шляхам напісаньня пратаколаў на белмове, як гэта робіцца, але пры выступленьнях на сходах, пасяджэньнях, дакладах, гутарках і інш.

АВАДЗЕНЬ.

З ГІСТОРЫІ БАРАЦЬБЫ З НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫЗМАМ

НАЦЫЯНАЛ-ШАВІНІЗМ ПАД МАСКАЙ БАЛЬШАВІЗМУ *)

Але гаварыць так, значыць наклікаць на сябе абвінавачаньне з боку ідэолёгаў нацыяналізму і бесьсьвядомых прыхільнікаў у «тэндэнцыйнасьці» і «няўсёроўнасьці». Мала таго, усякаму таварышу, салідарнаму з нашымі поглядамі, адкрываецца магчымасьць стаць пёрад фактам асабістай непрыязьні з-за надазронасьці ў сваю чаргу ў «нацыяналізьме» і іншым «ізьме».

«Вялікадзяржаўны нацыянал-шавінізм» — крычаць тыя, якія зьяўляюцца глянцтаямі ўсіх скажоных поглядаў на разглядаемае намі пытаньне. Гэтыя рыцары сярэднявякоўя лічаць за лепшае часьцей за ўсё дэмагагічныя прыёмы барацьбы. Апошнія зусім адпавядаюць іх ідэёвым сродкам. Распачаць адкрытую барацьбу з праціўнікамі, узброенымі такой дасканалай зброяй, як марксызм-ленінізм, значыць ахвяраваць сябе на паражэньне. Сярэднявяковыя ідэёвыя сродкі мізэрны супроць падобнага роду зброі; адтэтуль і вядзе сваё пахаджэньне тактыка наскокаў, дэмагогіі, абвінавачаньня ў тэндэнцыйнасьці і г. д., і г. д. Да таго-ж абраны гэтымі людзьмі спосаб барацьбы загадзя прадракае «перамогу». Ён цалкам разьлічан на маўчаньне працаўнага боку. Хто пасьмее не згадзіцца з пастаноўкаю тэй ці іншай праблемы, якая так ці інакш закранае балючыя месцы ідэалёгіі нацыяналаў, той сам нацыянал-шавіністы, ды яшчэ вялікадзяржаўны. Паспрабуй «давесьці» адваротнае.

Такімі нягоднымі сродкамі можна дасягнуць цалкам «станоўчага» выніку. Месца марксыцкіх аргумантаў займае непрыкрытая дэмагогія. Асабліва характэрны ў гэтых адносінах выпад тэй-жа часопісі «Полымя» — у адказ на выданую да 10-годзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі кнігу (збор артыкулаў) «Кастрычнік на Беларусі».

«Пасьля прагляду зборніка «Кастрычнік на Беларусі», — заключае рэцэнзэнт «Полымя» — Н. С., — застаецца вельмі дрэннае ўражаньне ад тэндэнцыйнага падбору матар'ялу, аднабокасьці, недагаворанасьці і сьвядомага затушоўваньня шмат якіх важнейшых гісарычных фактаў». (Полымя», № 7, 1927 г., ст. 261).

Перш за ўсё, у чым рэцэнзэнт бачыць гэту «тэндэнцыйнасьць» падбору матар'ялу, аднабокасьць, недагаворанасьць? Якія гэта многія «важнейшыя гістарычныя факты сьвядомага затушоўваньня»? Кім?

Далейшыя разважаньні гэтага спрытнага рэцэнзэнта становяцца яшчэ больш разьвязнымі і дэмагагічнымі.

«Укладчыка зборніку, відаць, і ня цікавіла ні Беларусь, ні гісторыя, для якой ён ўзяўся падбіраць матар'ялы. Ён да гісторыі падыходзіць суб'ектыўна і разглядае ня так, як яму хочацца» (там-жа).

Паглядзім, наколькі справядліва шляхетнае абурэньне рэцэнзэнта.

Усе артыкулы, якія ўвайшлі ў зборнік, належаць удзельнікам Кастрычнікавае рэвалюцыі ў Беларусі і не выклікаюць ніякіх сумненьняў у іх партыйнасьці яшчэ таму, што ўсе яны былі ўжо надрукаваны ў розных партыйных выданьнях і галоўным чынам у часопісі «Пралетарская Рэвалюцыя» — органе Гістпарту ЦК УсеКП(б). Іменна тое, што ўсе артыкулы ў зборніку належаць выдатнейшым удзельнікам Кастрычнікавае рэвалюцыі ў Беларусі, мы лічым вялікай вартасьцю гэтага зборніку. Ня тое рэцэнзэнт: ён лічыць **такі** падбор матар'ялаў «тэндэнцыйным» і «аднабокім» і, з усёй уласьцівай падобным людзям, сапраўднай аднабокасьцю накідаецца на ўкладчыка гэтага зборніку т. Агурскага, абвінавачваючы яго ва ўсіх сьмяротных грахох.

Справа, зразумела, не ў асобе ўкладчыка зборніку. Укладчык у даным выпадку надаў толькі знадворны выгляд гэтаму выданьню, унутраны-ж бальшавіцкі зьмест гэтаму каштоўнаму і рэдкаму беларускаму выданьню надалі артыкулы непасрэдных удзельнікаў Кастрычніка ў Беларусі т.т. Кнорына, Мясьнікова, Дзьмітрыева, Фаміна, Любімава, Калмановіча, Хатаевіча і інш. Але, ня маючы грамадзянскае сьмеласьці выступіць супроць гэтых таварышоў, рэцэнзэнт «Полымя» з зубоўным скрогатам нападае выключна на ўкладчыка зборніка. Апошняга рэцэнзэнт вінаваціць у «тэндэнцыйнасьці», у «аднабокасьці» і ў «недагаворанасьці».

Ня вытрымлівае таксама крытыкі і паказаньне рэцэнзэнта на тое, што ў зборніку «сьвядома затушаваны (Кім? Як відаць, самімі ўдзельнікамі Кастрычніка. **М. Ш.**) многія важнейшыя гістарычныя факты». І сапраўды. Можна падумаць, што ў зборніку няма ні слова аб ролі камуністычнае партыі, рабочае клясы і сялянства ў рэвалюцыі на Беларусі, што не асьветлена роля саветаў у Кастрычнікавым перавароце. Іменна **такія** факты мы прывыклі лічыць важнейшымі. Але не на адсутнасьць гэтых фактаў скардзіцца рэцэнзэнт. Усе яны атрымалі належнае асьвятленьне. У зборніку выдатнейшыя ўдзельнікі Кастрычнікавае рэвалюцыі ў Беларусі, старыя бальшавікі пісалі **бальшавіцкую** гісторыю на Беларусі. Усякія абвінавачаньні ўкладчыка зборніку ў тым, што яго «ня цікавіла ні Беларусь, ні гісторыя» — ёсьць злосны паклёп.

* * *

Усякага рабочага і партыйнага чытача заметкі Н. С., як відаць, перш за ўсё зьдзівіць тая акалічнасьць, што аўтар яе гусім не адзначае станоўчых бакоў выданьня «Кастрычніка на Беларусі» і сканцэнтроўвае крытыку, якая месцамі пераходзіць у простую незалежнасьць да выданьня — выключна на яго адмоўных бакох. Да гэтага часу такія спосабы разбору гісторыка-рэвалюцыйных твораў кляймяліся самым бязьлітасным чынам. Гэта не таварыская крытыка выданьня, якое мае партыйную марку, а шалёнае цкаваньне яго. Падобную крытыку можна было дапусьціць хіба толькі ў адносінах да якога-небудзь твору, які сваім духам чужы бальшавізму. Ні выдавец, ні ўкладчык зборніку не маглі чакаць ад органу савецкага друку такога абурэючага імкненьня апляваць названае выданьне, якое правяў рэцэнзэнт «Полымя». Яго шчырасьць па гэтай частцы сапраўды бяспрыкладная і наўрад ці знойдзе сабе прэ

Надыходзяць манэўры--дні баявой праверкі

МАНЭЎРЫ---АГЛЯД ДАСЯГНЕНЬНЯЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА Ў ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Задача кожнага рабочага, селяніна, кожнага працоўнага--усімі мерамі дапамагаць правядзеньню манэўраў

Бальшавіцкае прывітаньне

(Артыкул члена бюро ЦК КП(б)Б т. СЯНЬКЕВІЧА)

Бандыцкія налёты кітайскіх чан-кай-шыстых, відавочная падрыхтоўка да барацьбы з рэспублікай працоўных нашых блізкіх суседзяй, востра ставяць перад пралетарыятам, перад усімі працоўнымі пытаньне абароны краіны. Правакацыя кітайскіх генэралаў, падбухторваных да барацьбы з намі імпэрыялістычнымі дзяржавамі, сустрэла моцны адпор з боку ўраду СССР, узварушыла усе працоўныя масы і выявіла іх гатоўнасьць замяніць молат і плуг на кулямёт і на вінтоўку.

Слаўная Далёка-Ўсходняя Чырвоная армія, паказала, што яна, як і ўся Чырвоная армія, дастаткова баяздольна, каб даць па руках зарваўшымся бандытам.

Працоўныя ўсяго Саюзу прадэманстравалі перад усім сьветам свае адносіны да Чырвонай арміі сваімі ахвярамі ў фонд узмацненьня абароназдольнасьці краіны, абароназдольнасьці Чырвонай арміі, сваёй ахвотай стаць у рады чырвоных байцоў.

На тэрыторыі Бабруйшчыны пачынаюцца вялікія манэўры, тых частак Чырвонай арміі, якія стаяць на варце нашых заходніх межаў.

Пачынаецца экзамэн баяздольнасьці нашых чырвоных байцоў і іх камандзіраў.

Тая ўпартая вучоба, якую мы назіралі праз увесь час у лягерах, у казармах, на палігоне, у ленінскіх палатках, тая дысцыплінаванасьць Чырвонай арміі, аб якой газэты пішуць, нават, нашы ворагі, дае нам упэўненасьць сказаць, што гэты экзамэн чырвоныя байцы і іх камандзіры з гонарам вытрымаюць.

Парукай гэтаму зьяўляецца і тое, што Чырвоная армія, у працівагу капіталістычным арміям, зьяўляецца непадзельнай часткай усіх працоўных, што яна, разам з усімі працоўнымі, захоплена энтузіязмам сацыялістычнага будаўніцтва, захоплена пралетарскай рашучасьцю змагацца са зброяй у руках супроць усіх тых, хто асьмеліцца перашкаджаць сацыялістычнаму будаўніцтву.

Пачынаецца экзамэн і для грамадзкіх арганізацый, іх здольнасьці дапамагчы Чырвонай арміі, зрабіць найбольш спрыяючыя ўмовы для яе працы.

Дамо рашучы адпор цёмным кулацкім сілам, якія ў сувязі з манэўрамі распускаюць чуткі аб вайне, імкнуцца пасеяць паніку, трывогу.

Увага ўсіх рабочых і працоўнага сялянства павінна быць узмоцнена да Чырвонай арміі.

Слаўным чырвоным байцом і кампалітскладу шлем гарачае пралетарскае прывітаньне!

Самарцы дапамаглі

У вёсцы № пад націскам кулакоў існаваўшы калгас разваліўся. З 15 двароў засталося ў калгасе толькі 3 двары. **Самарцы пайшлі насустрач беднаце.** Быў скліканы сход, сялян, па якім палітаддзелам дывізіі з дакладам пасланы быў паліткіраўнік **т. Маскалёў.** Даведаўшыся аб гэтым, кулакі і падкулачнікі парушылі сарваць сход, але ім гэта не ўдалося і сход адбыўся, прычым на сходзе была такая актыўнасьць, што кулакі былі вымушаны «дэманстрацыйна» яго пакінуць. **Выступала ня толькі моладзь, але старыя. Выступалі актыўна жанчыны. Сход зацягнуўся да 4 гадз. ночы і вынік сходу наступны: у колгас запісаўся 31 чал. (двор).**

Характэрна выступленьне аднаго старога 60-ці год, які заявіў: «Мне ўжо 60 год, жыў я і нічога не разумеў. Я ўсё лічыў, што нашы кулакі гавораць праўду, і іх слухаў. Толькі сёньня, прасядзеўшы ўсю ноч на сходзе, я зразумеў, як я глыбока памыляўся. А пераканаць мяне мог толькі таварыш-чырвонаармеец. К чорту ўсіх кулакоў. Я прашу запісаць мяне ў калгас».

Пасьля сходу, на наступны дзень, у часе абрэзкі зямлі для калгасу ў вёску № быў высланы аркестр і для беднаты было сапраўднае сьвята. Насельніцтва ўсё вышла на вуліцу і з аркестрам накіравалася ў поле, дзе пад гукі «Інтэрнацыяналу» быў убіты першы слуп, які аддзяляе зямлю калгасу.

Скончыўшы абрэзку зямлі, **насельніцтва, са сьдзямі ўдзячнасьці на вачох, дзякавала самарцаў за зробленую дапамогу.**

Новыя калгасьнікі гаварылі: «калі ня было-б вас, таварышы чырвонаармейцы, ня было-б у нас і калгасу, да ягока мы так імкнуліся. Дзякуць вам за дапамогу!».

Так байцы-самарцы на практыцы ажыцьцяўляюць генэральную лінію партыі.

А. ГРЫШАНАЎ.

Раён манэўраў.

Любоў і павага родным чырвоным байцом

(Ад нашага спэц. карэспандэнта на манэўрах)

Надыходзячыя манэўры Чырвонай арміі ўзварушылі працоўныя масы Бабруйшчыны. У горадзе і вёсны пад кіраўніцтвам Бабруйскага АК КП(б)Б шпаркім тэмпам разгортваецца работа па аказаньні найлепшай дапамогі чырвоным байцом у час манэўраў.

На чале гэтай работы ідуць бабруйскія пралетары, якія робяць усё, каб апраўдаць той гонар, які падаецца назвай: «Бабруйскія манэўры».

На радзе сходаў рабочыя ўхвалілі: «дзень адкрыцьця манэўраў абвясьціць сьвятам, адпрацаваўшы за гэты дзень бліжэйшую нядзелю».

Ужо зараз горад мае сьвяточны выгляд: вуліцы, устаповы і прыватныя дамы ўпрыгожаны лёзунгамі, зелянінай, партрэтамі правадыроў партыі і Чырвонай арміі: т. т. Сталіна, Калініна, Варашылава, Будзённага, Ушліхта.

У рабочых клюбах панае надзвычайнае ажыўленьне. Усюды—адзін дамінуючы лёзунг: **«Манэўры яшчэ больш узмацняюць сувязь працоўных з Чырвонай арміяй».**

На працягу апошніх трох-чатырох тыдняў праводзілася растлумачальная работа на фабрыках, заводах і ўстановах. Там працоўныя Бабруйску з нязвычайным уздымам ухвалілі аказаць усямерную матар'яльную і маральную дапамогу сваёй роднай Чырвонай арміі, якая завяршае сваю баявую вучобу манэўрамі. **На ўсіх сходах аднадушна ўхвалена: адлічыць аднадзенны заработак на падарункі байцом, а таксама пачаць збор сродкаў на пабудову танку «Камуністы».** Кампанія збору сродкаў праходзіць пасьпяхова. На сёньнешні дзень **прафсаюзы сабралі да 15.000 рублёў на падарункі байцом.**

Баявая дапамога бабруйскіх пралетараў выявілася ў вылучэньні сваіх лепшых сіл у **зводны батальён Асоавіяхіму,** які будзе ўдзельнічаць у манэўрах. На прадпрыемствах арганізуюцца меры ВПА. **Чырвоны Крыж арганізаваў дзьве санітарныя брыгады** для абслугоўваньня часьцей у час паходу, падрыхтаваў падарункі, выпусьціў лістоўку да насельніцтва і г. д. **Рабочая каапэрацыя ўзяла на сябе арганізацыю палявых ларкоў і забесьпячэньне іх прадуктамі.** Пашырана сетка сталовак у горадзе. Апрача гэтага **накіравана ў вёску да 30 кінопересоўак. Грамадзкія органы праводзяць работу па забесьпячэньні Чырвонай арміі найлепшых магчымасьцяй руху.**

Вёска не адстае ад гораду. Яшчэ сёньня няма поўных вестак аб тым, што намячаюць асобныя вёскі і раёны насустрач сваёй Чырвонай арміі. Але адно ясна: **серадняцтва і беднота Бабруйшчыны рыхтуюць чырвоным байцом урачысты, братэрскі прыём і да гэтага шпарка рыхтуюцца.** Такі вывад зрабіў сакратар **АК т. Грысевіч,** які аб'яжджаў некаторыя раёны і з якім нам давялося мець гутарку па гэтым пытаньні.

— **У раёнах працавала да 50 агітацыйных брыгад, якімі ахоплены амаль усе населеныя пункты.** Удзельнікі брыгад расказваюць, што аспоўныя масы сялянства вельмі прыхільна і ўважліва адносяцца да манэўраў, даючы самы рашучы адпор правакацыйнай агітацыі кулацтва.

У Сьвіслацкім, Старадарожскім і Рагачэўскім раёнах, аб якіх мы атрымалі весткі, сялянства ўступае ў спаборніцтва на лепшую сустрэчу і дапамогу Чырвонай арміі.

Так, у **Сьвіслацкім раёне сабрана ўжо 500 руб. на падарункі байцом і 597 руб. на танк «Камуністы».** Падрыхтоўваецца цэлымі вёскамі калектыўная здача хлеба.

Арганізавана 5 новых ячэек Асоавіяхіму, адна ячэйка МОПР'у і адна Чырвонага Крыжу.

У другім раёне **сяляне дружна рамантуюць масты і дарогі,** чысьцяць калодежы, вывешваюць вёдры, падрыхтоўваюць начастунак байцом, якія будуць праходзіць праз сёлы. **Жанчыны-сялянкі, на чале з дзлегаткамі, арганізуюць збор ануч і пашыўкі кісетаў чырвонаармейцам.** Вуліцы ў вёсках пасыпаюцца жоўтым пяском і ўпрыгожваюцца аркамі, прычым часта справа даходзіць да спрэчак: каля чыёй хаты паставіць арку (Сьвіслацкі раён). Апрача гэтага па многіх раёнах, да манэўраў прысьвячаюцца адкрыцьці новых калгасаў або прыём новых сем'яў. Вельмі важна адзначыць, што **бядняцка-серадняцкая частка трымаецца вельмі стойка, даючы ўзоры клясавай сьвядомасьці ў адносінах да ўсіх пошукаў кулацтва.**

Так, калі кулакі на вёсцы Ясенейкі, Сьвіслацкага раёну, прабавалі сарваць калектыўную здачу хлеба, **батрак т. Майдукоў Антон выступіў і сказаў: «Я ўношу 5 пудоў і прапаную абвясьціць байкот кулаком».** Гэта прапанова была дружна падтрымана ўсім сходам, а праз дзень-два кулакі прымушаны былі прыйсьці з «павіннаю». Падобныя-ж узоры бядняцка-серадняцкай актыўнасьці адзначаны ў радзе іншых раёнаў. Работа ў раёнах праводзіцца арганізавана і дружна. У ліку некалькіх адсталых раёнаў быў дасюль Слуцкі раён, дзе невыстарчальна была разгорнута работа брыгад. Зараз тэмп работы значна ўзмацніўся.

***

Так працоўныя Бабруйшчыны рыхтуюцца да братэрскай дапамогі сваёй Чырвонай арміі ў часе найбольш адказнага этапу яе вучобы—манэўраў. Адпадушны голас працоўных мас:

— **Любоў і павага родным чырвоным байцом!**

Р. К—кі.

Тав. Галадзед аб манэўрах

Нам трэба максымальную ўвагу зьвярнуць на пытаньне абароны СССР.

Я ня буду шмат гаварыць аб значэньні гэтага пытаньня, яно ясна для ўсіх, бо досыць напомніць аб канфлікце на Кітайска - Ўсходняй чыгунцы, досыць напомніць аб гандлі паміж капіталістычнымі дзяржавамі, які толькі што праходзіў у Гаазе, досыць напомніць на яскравае абвастрэньне клясавай барацьбы ў капіталістычных дзяржавах, якое зараз мы наглядаем, і на тыя супярэчнасьці, якія растуць паміж паасобнымі капіталістычнымі дзяржавамі, каб ведаць аб тым, што пытаньне падрыхтоўкі вайны супроць СССР в боку імпэрыялістычных дзяржаў — гэта пытаньне не тэарытычнага зьместу, а рэальнае пытаньне, і таму падрыхтоўка краіны да абароны ў сучасны момант, як ніколі, стаіць рэальна, і нам прыдзецца на падрыхтоўку да абароны ўсёй нашай народнай гаспадаркі, у тым ліку і мясцовай, зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу.

У гэтай частцы работы—падрыхтоўцы да абароны ў нас адыгрываюць вялікую ролю вайсковыя манэўры, якія будуць праводзіцца ў хуткім часе на тэрыторыі БССР. Гэтыя манэўры, між іншым, маюць буйнае значэньне для ўсёй БССР, для ўсёй КП(б)Б. Мала таго, што на манэўрах будзе правярацца баяздольнасьць Чырвонае арміі, на гэтых манэўрах па сутнасьці мы будзем правяраць, як уся БССР, у першую чаргу партыя, рабочая кляса і працоўнае сялянства падрыхтаваны да абароны СССР.

Нам трэба праверыць, як мы ў нашых гаспадарчых плянах улічваем запатрабаваньні ўзмацненьня Чырвонай арміі і падрыхтоўкі ўсёй нашай гаспадаркі да ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны.

Такім чынам, манэўрам, разам з прадугледжваемым у нашых кантрольных лічбах пытаньнем абароны трэба ўдзяліць вялікую ўвагу. Мне думаецца, гэта будзе праверкай работы КП(б)Б па яе падрыхтаванасьці да абароны і як КП(б)Б арыентуе і падрыхтоўвае масы ў гэтай важнейшай справе.

Камсамол і манэўры

(Артыкул сакратара ЦК ЛКСМБ т. Галавача)

Пачынаюцца манэўры. Камсамольскія арганізацыі праявілі значную падрыхтоўку да манэўраў, у значнай ступені мабілізавалі сябе да манэўраў. Мы маем весткі аб тым, што пытаньне аб манэўрах абгаворвалася на актывах, што праводзілася растлумачальная праца сярод насельніцтва, што арганізацыя прыняла актыўны ўдзел у камплектаваньні Асоавіяхіму батальёнаў, што арганізацыямі вылучаны баявыя дружыны для аховы мастоў, чыгуначных шляхоў, прадпрыемстваў і правяла рад іншых мерапрыемстваў.

Манэўры будуць у значнай долі праверкай нашай (камсамолу) падрыхтоўкі да абароны Савецкага Саюзу. Зусім зразумела рэч, што варожыя нам элементы, кулацтва, будуць пускаць плёткі «аб вайне», будуць імкнуцца сеяць у насельніцтва паніку. Таму нельга ні ў які разе задаволіцца праведзенай растлумачальнай працай. Трэба сярод моладзі і ўсяго насельніцтва вытлумачыць сутнасьць нашых манэўраў, нашы задачы па ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны і выкрыць з усёй рашучасьцю кулацкую сутнасьць рознага роду плётак. хлусьні. Трэба, каб створаныя дружыны па ахове дарог, чыгуначных шляхоў былі на сваім месцы, змаглі-б выканаць сваю ролю.

Вельмі важныя задачы камсамольскіх ячэек і арганізацый — арганізацыя сустрэч манэўруючых войск, якія павінны садзейнічаць узмацненьню ваяннізацыі насельніцтва, набліжаць працоўных да жыцьця Чырвонае арміі. Камсамольцы, вылучаныя ў батальёны, павінны быць сапраўды ўзорам прыкладнасьці, дысцыплінаванасьці для радавога байца. У часе манэўраў кожная камсамольская арганізацыя павінна праверыць сваю баяздольнасьць.

Байцы аб манэўрах

МЫ ПАДРЫХТАВАНЫ

(Гутарка з вайсковым камісарам № артпалка)

Адразу пасьля прыходу з лягераў мы пачалі рыхтавацца да манэўраў. У склад палка мы прынялі папаўненьне—чырвонаармейцаў запасу, актыўных удзельнікаў грамадзянскай вайны.

Ужо партарганізацыя азнаёмлена з задачамі палітработы на манэўрах і праводзіць вялікую работу сярод кадравых чырвонаармейцаў і запасьнікаў.

Зараз праводзіцца падрыхтоўка нізавога актыву — групавікоў, чытачоў, вайскораў. Сярод начскладу таксама праведзена належная работа.

Асаблівая ўвага ў падрыхтоўцы зьвернута на зьмест і формы работы і на падрыхтоўку да работы сярод насельніцтва.

Ужо палкавая шматтыражка і ільлічоўкі выпусьцілі некалькі нумароў, прысьвечаных манэўрам.

Гаспадарчы апарат таксама належным чынам падрыхтаваны.

Сацыялістычнае спаборніцтва на манэўрах будзе шырока разгорнута, бо для гэтага ёсьць належная глеба — добрыя вынікі спаборніцтва летніх практычных заняткаў.

Зацікаўленасьць манэўрамі з боку ўсяго складу асаблівa з запасьнікаў ёсьць, і я ўпэўнены, што на манэўрах полк пакажа свае дасягненьні.

ПАДВЯЛІ ВЫНІКІ ЛЕТНЯЙ ВУЧОБЫ

Тав. Пятроў, (сакратар яч.)

Ячэйка цалкам і кожны партыец пасобку да манэўраў падрыхтаваны. Мы правялі сход ячэйкі, на якім падагулілі вынікі лягерной вучобы і намецілі задачы, якія стаяць перад намі.

Асаблівую ўвагу мы зьвяртаем на падрыхтоўку актыву. Чырвонаармейскі на- [illegible] — праведзены склад таксама рыхтуецца [illegible] на (гэзу) [illegible] палітзаняткі, па-за школьная работа. Цэнтрам работы мы лічым баявую падрыхтоўку і сувязь з насельніцтвам.

МАНЭЎРЫ ДОБРА АЗНАЁМЯЦЬ З БАЯВЫМІ АБСТАВІНАМІ

(Чырвонаармеец т. Казакоў)

Манэўры зьяўляюцца праверкай нашых дасягненьняў. Яны дадуць нам магчымасьць добра азнаёміцца з умовамі баявой работы. Чырвонаармейцы вельмі многа чытаюць літаратуры аб манэўрах. Кожны праяўляе вялікую зацікаўленасьць.

ПАКАЖАМ, ШТО ДОБРА УЛАДАЕМ ЗБРОЯЙ

(Тав. Сыбараў, чырвонаармеец кіраўніцтва №-скай дывізіі)

Я лічу галоўным на манэўрах баявую вывучку і работу сярод насельніцтва. Мы павінны паказаць рабочаму і селяніну, што наша армія моцная і добра ўладае сваёй зброяй.

Я раблю заўвагу ўсім, каб мы ўмелі захаваць вайсковую таямніцу, бо ворагі за намі сочыць.

Мы ўжо падрыхтаваны ўсебакова.

С. К.

Раён манэўраў.

Як была адбіта атака з паветра

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта на манэўрах)

Сёньня чакаем налёту на горад самалётаў «непрыяцеля». Ідзе ліханманкавая падрыхтоўка да адпору паветранаму ворагу.

Налёт ня страшны, калі яму будзе супроцьпастаўлена арганізаванасьць і дысцыпліна насельніцтва, нашых прадпрыемстваў і наземнай аховы. Паніка—найлепшая паслуга самалётам праціўніка.

Але ў даным выпадку гэтага ня было. Яшчэ напярэдадні мясцовыя органы ўлады папярэдзілі насельніцтва аб магчымым паветраным нападзе, шырока паведаміўшы праз спэцыяльныя адозвы. Каманды Асоавіяхіму ў баявой гатоўнасьці.

Рухавыя прамяньні пражэктароў, раз'ходзячыся і перакрыжоўваючыся паміж сабою, праз ўсю ноч паласа́валі неба...

Горад заснуў трывожным сном... Сонечная раніца абяцала прыгожы цёплы дзень... Хто-колечы, пад уплывам цяпла і сонца, гатоў быў забыцца пра паветраную небясьпеку...

Але вось раптам а 9-й гадзіне раніцы горад напаўняецца трывожнымі гукамі сірэны...

Трывога! Заўважылі «варожых» сталёвых птушак. Насельніцтва аглядаецца аб небясьпецы.

Вось з захаду, з-над прыкрыцьця лесу, паказваюцца і самыя «драпежнікі».

Бяручы напрамак на галоўны нэрв гораду — чыгуначную станцыю, — іх сталёвае стракатаньне напаўняе сабою калідоры гарадзкіх вуліц. У непадлеглай абстрэлу частцы гораду яшчэ не спыніўся звычайны рух. Вартавыя міліцыянэры падрыхтоўваюць процівагазы.

Я з усіх ног кідаюся ў бок ад чыгуначнае станцыі... Праз дзесяць хвілін я ўжо амаль каля вакзалу, у паласе, атручанай газамі «ворага». Прабую прайсьці далей, але... чую рэзкі воклік «назад»! Аказваецца, што я зьявіўся «бязазбройным», не заўважыўшы, што я бяз маскі. Спасыланьне на спэцкораўскую белую павязку не памагло і ў раён вакзалу мне прайсьці так і не ўдалося. Лішні довад таго, што процігаз зьяўляецца лепшым сродкам самаабароны нават і такім «мірным» людзям, як карэспандэнты газэт.

З-за гэтага прыкрага выпадку мне прышлося наглядаць «бамбежку» станцыі здалёк... Самалёты «ворага» скінулі некалькі агнявых і хэмічных бомб у раёне станцыі і палатна чыгункі. Аднак, чыгуначнікі праявілі адпаведную арганізаванасьць і вытрыманасьць, хутка спыніўся манэўровы рух на станцыі. Праходзілі толькі чарговыя цягнікі на раскладу. Публіка выдалена ў бясьпечныя месцы. Дзякуючы гэтай дысцыплінаванасьці рабочых, выстаўленай варце — разбурэньняў і ахвяр ад бомб «праціўніка» амаль ня было.

«Варожыя» самалёты, сустрэўшы дружны агонь нашых кулямётаў, устаноўленых у розных пунктах гораду, хутка зьніклі за небасхілам.

***

Так была адбіта першая паветраная атака «праціўніка» на горад. Але небясьпека засталася. Мяючы на мэце непарушнае нэрваваньне нашага тылу, «праціўнік» паўтарыў налёты на горад а 11-й і 14-й гадзіне, кідаючы бомбы ў раёне казарм, станцыі і штабу войск. Зноў надрыўна раўці гудкі.

Сваячасова заўважаныя самалёты былі спатканы кулямётным і артылерыйскім агнём і контр-атакай нашых «истребителей» (лёгкія самалёты, узброеныя кулямётамі).

«Вораг» упэўніўся, што як Чырвоная армія, так і насельніцтва не дадуць яму застаць сябе непадрыхтаванымі.

А нашы-ж чытачы няхай ведаюць, што «вораг», аб якім мы гаварылі ўвесь час, быў умоўным: налёт рабілі нашы чырвоныя лятуны, дэманструючы адзін з баявых эпізодаў манэўраў.

Але пра дысцыпліну, процігазы, пра газасховы і ахову фабрык ды заводаў ад небясьпекі з паветра — давайце ня будзем забываць ніколі.

Р. Кр—кі.

На руку клясаваму ворагу

Работнікі **Вярхоўнага суду БССР,** зразумела, супроць правага ўхілу і прымірэнцтва. Ня раз дружна падымалі яны рукі за рэзалюцыю, якая рэзка асуджала правы ўхіл, прымірэнцтва ў ідэалёгіі і на практыцы. Тым больш яны, напэўна, абрушваюцца з усёй сілай на тых, хто тым або іншым спосабам прабуе ашукаць нашу пільнасьць, скарыстаць літару (літару, а ня сутнасьць) закону для ўзмацненьня пазыцыі клясавага ворага. Так яно і павінна быць. На тое яны і работнікі Вярхоўнага суду—гэтага органу дыктатуры пралетарыяту.

Ня ў меншай меры датычыць гэта і работнікаў Галоўпракуратуры БССР. Ужо каму-каму, а галоўпракуратуры і ўдзень і ноччу належыць пільна сачыць, моцна біць па ўсіх скажэньнях клясавай лініі, па зажыме самакрытыкі, па тых, хто грае на руку клясаваму ворагу. Няхай клясавы вораг ведае, што мы разьвіваем наступленьне на яго.

Усё гэта прадмова. Прыступім да выкладаньня.

У цэнтральнай беларускай прэсе аб Лапіраву, яго булыжніках і галоўпракультуры не паведамлялася. Справа гэта не пазбаўлена цікавасьці, і мы коратка аб ёй раскажам. Лапіраў—клясавы вораг. Лапіраў—буйны нэпман. Яго спэцыяльнасьць—пастаўка дзяржустановам булыжніку і ашуканства. А ашукваў ён гомельскіх і іншых савецкіх дурняў досыць грунтоўна. Факты? Значны капітал, нажыты на ашуканстве, які ён старанна хавае ад фінаддзелу. Гомельскі акрфінаддзел зрабіў глыбокую разьведку ў лапіраўскія капіталы. У выніку—падатак у досыць буйной суме. Але Лапіраў—ня дурань. Падаткаў ён плаціць ня хоча і нават ухіграецца, калі за ім сочыць акрфінаддзел, атрымаць у адной з гомельскіх устаноў буйны аванс на пастаўку булыжніку. Акрфінаддзел налажыў вэта на дом Лапірава. Дом прызначаюць да продажы. На таргох дом прадаецца дзяржустанове, а сума, атрыманая ад продажы дому, ідзе на пакрыцьцё падатку, што лічыцца за Лапіравым. А праз некалькі дзён, загад галоўпракуратуры:

— Спыніць продаж. Прыцягнуць да адказнасьці асоб, дапусьціўшых (!!) таргі (г. зн. кіраўнікоў фанаддзелу).

Абараняючы інтарэсы Лапірава, галоўпракуратура ў той-жа час выказвае падазронасьць, што прысутныя на таргах прадстаўнікі акруговай інспэктуры аховы здароўя і саюзу мэдсанпрацы рабілі нейкую махінацыю.

Галоўпракуратура, якая валэлілася за нос Лапіравым, сваю падазронасьць пакіравала не на клясавага ворага, а на дзяржаўныя і грамадзкія ўстановы. Літара закону была для яе вышэй яго клясавага сэнсу.

Ну, і што-ж у канчатковым выніку? Як паступілі з ярымі прававеднікамі наступленьня на клясавага ворага на словах і простымі дапаможнікамі яму на справах? Ня ведаем. Але думаем, што хваля самакрытыкі ня вынесла яшчэ іх са сьцен прытульнага і спакойнага габінэту, адкуль яны так лёгка пісалі загады, якія дапамагаюць клясаваму ворагу. Можна, гласуючы супроць правага ўхілу, быць канкрэтным насіцелям гэтага зла. Хіба-ж гэта ня так было і з Наркамфінам, і з Галоўпракуратурай?

Цяпер аб словах і, галоўным чынам, аб «справах» Вярхоўнага суду БССР. Гомельская газэта «Полесская Правда» гады паўтара таму назад абурылася супроць бясчынству камунаддзелу. Са старонак газэты на працягу доўгага часу ня сходзілі цёмныя «справы» камунаддзелу. На ногі была пастаўлена ўся грамадзкасьць. Гомельскай пракуратурай была заведзена справа. У выніку ўзьнятай газэтай, пры падтрыманьні рабочай грамадзкасьці, кампаніі ўдалося вызваліць і праз судовыя органы перадаць дзяржаве рад памылкова і злачынна ненацыяналізаваных дамоў, уласьнікі якіх або ўцяклі з белымі за мяжу, або выехалі няма ведама куды, перадаўшы незаконна свае дамы іншым асобам.

У ліку адлучаных, пасьля ўзьнятай у газэце кампаніі, дамаўладаньняў быў дом былога супрацоўніка камунгасу Пракопенка. Разам з домам былі націяналізаваны сад і вучастак зямлі каля дому. Ня цяжка сказаць, як Пракопенка набыў дом, які раней належаў Усіевіч. Пару слоў аб Усіевіч. Усіевічы—нашы клясавыя ворагі. Яшчэ зараз у беларанскай Польшчы, блішчучы афіцэрскім мундзірам, знаходзяцца члены сям'і Усіевіч. Рэшткі разьбітага дашчэнку роду Ўсіевіч даживаюць свае дні ў Гомелі.

Дар'я Ўсіевіч у 1928 г. уступае ў зьдзелку з Пракопенка. Гэта—зьдзелка прадстаўніка дзяржустановы з беларгвардзейскай публікай. Уласьнікам становіцца Пракапенка. Па халайніцтве акруговай пракуратуры, акрсуд вырашае справу на карысьць дзяржавы. Ну, а далей, пачынаецца гісторыя, падобная булыжнікам Лапірава.

Вярхоўны суд у згодзе з заключэньнем пракуратуры БССР зацьвярджае пастанову акрсуду аб адабраньні дамаўладаньня Усіевіч, але... але ня поўнасьцю. Пайшлі агаворкі, разважаньні. Пракапенка, моў, працоўны і што факт продажы Ўсіевіч Пракапенка зямлі нічым, моў, не даведзены. Акрсуд быццо запрапанавана справу перагледзець. І акрсуд вырашыў яе так, як хацелі ў цэнтры. Другі раз Вярхоўны суд пакінуў сядзібу з садам за Пракапенка.

«Працоўны» (для кітэні сваёй) Пракопенка сьвяткуе перамогу. Ён кудысьці паехаў з Гомелю. Паверны ў яго справах Чарнухін падаў у суд іск на ЖАКТ «Пралетары» з патрабаваньнем спагнаць з апошняга 200 руб. за карыстаньне садам. І суд напэўна спагоніць. З каго? З ЖАКТ'у «Пралетары». Каму? Пракопенка. Таму Пракопенка, пры мазаўшыся да савецкае ўстановы, змыкаўся з белагвардзейскай сям'ёй, які незаконна атрымаў сядзібу. Суд, савецкі суд, будзе спаганяць гэтаму простаму падсобніку клясавага ворага, кампаньёну Усіевіч, якая незаконна ўладала домам і сядзібай Аляксея Усіевіч, заяднала белагвардзейца, які ўцёк у Польшчу. Па форме правільна, а па сутнасьці зьдзек. Зьдзек са чаго, таварышы з Вярхоўнага суду? Зьдзек са здаровага сэнсу, з нашага наступленьня на клясавага ворага.

А аб іншых «справах» Вярхоўнага суду БССР у другі раз.

С. Г—скі.

Чырвоныя партызаны напагатове

Калі Савецкі Саюз разгортвае вялізарную работу па намечаным пляне сацыялістычнага будаўніцтва, сусьветная буржуазія, упэўніўшыся, што Савецкі Саюз, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, гэты плян выканае, — старасецца ўсімі сіламі нам перашкаджаць.

Сусьветны капітал рыхтуецца напасьці на нас і ў першую чаргу нацкоўвае кітайскіх генэралаў і белых эмігрантаў на Ўсходзе.

Мы, чырвоныя партызаны Беларусі, абяцаем па першым закліку нашага ўраду рынуцца на абарону заваяваньняў чырвонага Кастрычніка, мы лічым сябе мабілізаванымі, мы згодны хоць зараз стаць у рады Чырвонае арміі, каб бараніць межы СССР.

Прыстасаваўшы сваю заяву да пачатку вялікіх беларускіх манэўраў, мы заклікаем усіх працоўных аказваць нашай роднай Чырвонай арміі ўсякую дапамогу ў яе баявой вучобе, акружыць яе ўвагай і клопатамі.

У знак нашай гатоўнасьці стаць на абарону нашай краіны, мы, ніжэйпамянёныя, група быўшых партызан Беларусі, **уносім у фонд для пабудовы сталёвага разьведчыка «Беларускі Чырвоны Партызан».**

Усіх таварышоў, чырвоных партызан просім адклікнуцца на наш заклік і ўносіць грошы на пабудову сталёвага разьведчыка «Беларускі Чырвоны Партызан».

Група чырвоных партызан:

1. **Быль Л.** — уносіць 25 руб. і выклікае на такую-ж суму асабіста чырвоных партызан: т. Трусевіча І. — камвуз; т. Ляўкова — ЦКК КП(б)Б; т. Карытава — ДПУ; т. Тыманюка — ЦС Асоавіяхіму: т. Нароўскага — ЦК КП(б)Б; Піка — ДПУ; т. Буцко — прац. Мазыр. акр. і т. Ігнатоўскага У. — быўш. кіраўніка падполья.

2. **Скамарох Герман** — уносіць 15 руб. і выклікае на такую-ж суму асабіста кожнага: т. Дразда Я. — Аршанскі тэхнікум; т. Русака М. — Рагачоўскі тэхн., т. Жабінскага — газ. «Зьвязда»; т. Камлюка Васіля — Менск; т. Касьцюк Н.—Галоўпошас; т. Казячага Р. — «Савецкая Беларусь» і т. Пракулевіча У. — дзярж. бібліятэка.

3. **Парук А.** — уносіць 10 руб. і выклікае на такую-ж суму асабіста: т. Карповіча, М. — СНКБ; Голуба Г. — Капыльская сямігодка; Піліпіка А. — 31-я сямігодка; т. Калініўскага — быўш. пасла бел. кл. у польскім сойме; т. Курылоніча — доктара Камвузу і Чарныш'эвіча С. — Менск. акр.

4. **Пятровіч, М.** — уносіць 10 рублёў і выклікае: т. Шамрука — Менск; т. Альфэра Ю. — Менск; т. Сяўко З. — Ц. дом селяніна; т. Сенькіна — МЦРК, т. Клінцэвіча В. — МЦРК, т. Каўруса Я. — ДПУ; т. Сакалоўскага — Мен. сав. Асоавіяхіму і т. Леўчука — бяч. рабфак.

5. **Пятровіч, Я.** — уносіць 5 рублёў і выклікае: т. Нігярына Я. — студ. Камв. Мен. Зах. у Маскве, т. Гунько — Арш. чыг. вуз, т. Мацэўчука — Фрунз. райком, т. Макара А. — абойн. фабрыка, Менск, т. Буйноўскага П. — Барыс. вайсков. часьць, т. Кумпеля М. — дражджавы завод, Якімюка Ф. — заг. «Бальшавік», т. Кудрава — Наркамправы і т. Зубрыцкага — Барысаў.

П—м.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Дапамога сем'ям чырвонаармейцаў

ВОРША, 12/IX. (Наш кар.). Акрыканком запрапанаваў усім райвыканкомам праверыць пастаноўку работы па аказаньні дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў. На прэзыдыумах РВК будуць заслуханы даклады упоўнаважаных Сабесу наконт канкрэтнай дапамогі сем'ям чырвонармейцаў. Усе заявы чырвонаармейскіх сем'яў аб аказаньні ім дапамогі будуць разгледжаны ў першую чаргу.

АПА Менакругкому паведамляе, што з панядзелка, 16 верасьня, пачнецца прыём у вячэрнюю савецкую партыйную школу. Сакратаром ячэек: ф-кі «Беларуска», друкарні «Зьвязда», зав. «Беларусь», Абойнай ф-кі, Працкалектыву вязкова.

Пашырэньне супроць пажарнае аховы

ВОРША, 12/IX. (Наш кар.). Дзяржстрах вызначыў для Аршаншчыны з прыбыткаў паводле сваіх апэрацый за 1927-28 год 24.982 руб. На ўсе гэтыя сродкі будуць набыты пажарныя інструманты для пажарных дружын.

Культпаход на Віцебшчыне

ВІЦЕБСК, 11/IX. (Наш кар.). Па Віцебшчыне пачаўся культпаход, які ставіць сабе мэтай масавую арганізацыю школ малапісьменных і поўную ліквідацыю ня пісьменнасьці сярод працоўных гораду, батрацтва, жанчын-дэлегатак і г. д. Створаны акруговы штаб. Такія-ж штабы арганізуюцца пры райвыканкомах і сельсаветах. Ствараюцца камісіі дапамогі культпаходу. Ужо прыступлена да практычнай работы. Учора адкрыліся курсы па падрыхтоўцы ліквідатараў няпісьменнасьці. З 15-га верасьня ў горадзе пачнецца вучот няпісьменных, а з 20-га—па раёнах. Увесь горад разьбіваецца на паасобныя вучасткі.

З-й ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

ВЕСКА ЗНАЧНА АДСТАЕ АД ГОРАДУ

(На нарадзе цэнтральнай камісіі па рэалізацыі пазык)

БССР было дана заданьне рэалізаваць 11.250 тысяч рублёў. Гэта сума разьмеркавана па асобных акругах наступным чынам: Віцебская — 1.300 тысяч руб., Вабруйская — 1.837.500 р., Гомельская—1.782 тысячы, Менская — 3.017 тыс., Магілеўская — 1.082 тыс., Мазырская — 672.500 р., Аршанская — 963.500 руб. і Полацкая — 584.500 руб.

Такім чынам, калі браць на сёньнешні дзень, то гэтыя лічбы ў большасьці акруг БССР выкананы больш як на 100 проц. і па ўсёй БССР выканана заданьне на 100,6 проц. Але гэта нас не здавальняе, бо мы назіраем тое, што большая сума рэалізуецца сярод арганізаванае часткі насельніцтва, у прыватнасьці сярод рабочых гораду. А калі мы возьмем вёску, то ўбачым лічбы зусім нездавальняючыя. На 1-га верасьня паогул заданьне сярод сялянства выканана ўсяго на 25,6 проц.

Асабліва адстаюць Мазырская і Полацкая акругі, ня гледячы на тое, што арыентыровачныя лічбы ў іх меншыя параўнальна з іншымі акругамі. Чым-жа тлумачыцца слабая рэаліз

Як правесьці праверку выкананьня сац. дагавароў

Часовыя кантрольныя камісіі павінны пачаць працу 1-га кастрычніка і скончыць 15-га кастрычніка

(З пастановы прэзыдыуму ЎсеЦСПС)

У ЦЭНТРЫ—РАБОЧЫЯ БРЫГАДЫ

Пачаць з паловы верасьня масавую праверку ходу спаборніцтва і вынікаў выкананьня гаспадарча-палітычных дагавароў.

З гэтай мэтай арганізаваць праз агульныя сходы рабочых і выторчыя нарады па цэхах, зьменах і аддзелах рабочыя брыгады па праверцы вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва. Брыгады арганізаваць у першую чаргу з ліку рабочых-добраахвотнікаў, а таксама з ліку ўдарнікаў і актыўных удзельнікаў сацыялістычнага спаборніцтва.

Брыгады павінны працаваць пад кіраўніцтвам выторчых камісій. ПК павінны дасканала праінструктаваць удзельнікаў брыгад аб задачах і парадку іх работы і аказаць ім максымальную дапамогу ў іх працы. Для арганізацыі работы ўнутры брыгады і размеркаваньня работы паміж яе ўдзельнікамі са складу брыгады абраць старшых брыгадзіраў.

Зьместам работы брыгад і асноўным напрамкам іх дзейнасьці павінна быць: а) праверка фактычнага ўцягненьня рабочых ў справу спаборніцтва і фактычнага іх удзелу; б) праверка і ацэнка работы выторчых камісій і нарад у пэрыяд спаборніцтва; в) праверка ролі адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу, дапамогі і ўдзелу гаспадарчых органаў у спаборніцтве, у прыватнасьці, у справе заахвочваньня ініцыятывы рабочых у спаборніцтве; г) даць ацэнку і падвесьці агульныя вынікі спаборніцтва па цэху, аддзеле ці зьмене і вывесьці вынік выкананьня абавязацельстваў, узятых на сябе данай групай рабочых у нарадку спаборніцтва; д) высьветліць усе прычыны, якія мелі адмоўны ўплыў на ход спаборніцтва, і тут-жа неадкладна зьнішчыць гэтыя тормазы, а таксама выявіць увесь каштоўны вопыт спаборніцтва, які трэба перанесьці ў іншыя цэхі і прадпрыемствы.

Асабліва ўважліва трэба аднесьціся да выяўленьня ўмоў працы груп і брыгад, мэтадаў і вынікаў іх работы. Ударныя брыгады пабываюць вялізнае значэньне: яны павінны стаць найбольш дзейнай формай удзелу рабочых у сацыялістычным спаборніцтве, ачагамі рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў; таму трэба дасканала праверыць, у якой меры практыка і мэтады іх работы ўлічаны і выкарыстоўваюцца гаспадарчым органам, і ў якім напрамку павінна пайсьці іх далейшая работа.

У праверачай рабоце трэба ўжыць мэтад узаемнай праверкі шляхам абмену прадстаўнікамі і паміж брыгадамі цэхаў і зьмен, якія ўступілі ў спаборніцтва. Такога роду ўзаемная праверка забясьпечыць правільнасьць узаемнага абмену практыкай работы. Мэтад узаемнага абмену праверачнымі брыгадамі трэба ўжыць і ў адносінах прадпрыемстваў у цэлым, якія ўступаюць у спаборніцтва [illegible] умове, калі тэта дазваляюць тэрытарыяльныя ўмовы (калі прадпрыемствы ў адным горадзе ці недалёка адзін ад другога).

Вынікі работы брыгады, яе вывады і заключэньне трэба паставіць на абмеркаваньне і зацьвярджэньне агульных сходаў рабочых у тым цэху або зьмене, дзе даная брыгада рабіла праверку.

ВЫНІКІ ПАДВОДЗЯЦЬ ЧАСОВЫЯ КАНТРОЛЬНЫЯ КАМІСІІ

Для абагульненьня вынікаў работы брыгад, падвядзеньня вынікаў спаборніцтва і вынікаў выкананьня дагавору па прадпрыемстве ў цэлым арганізаваць спэцыяльныя ВКК з кароткім тэрмінам работы (ня больш 2-х тыдняў) з такім разьлікам, каб іх работа пачалася з 1-га кастрычніка і была закончана не пазьней 15-га кастрычніка. Работа ВКК у асноўнай і галоўнай сваёй частцы павінна базавацца на матар'ялах і вывадах брыгад і ў супастаўленьні з імі справаздачных даных гаспадарчым органам аб працы прадпрыемства.

Задача ВКК—канчаткова падагуліць вынікі і даць ацэнку ходу спаборніцтва па прадпрыемстве ў цэлым і на падставе практычнага вопыту спаборніцтва, сабранага брыгадамі, выпрацаваць прапановы і вызначыць патрэбныя мерапрыемствы для далейшага яго разгортваньня і, нарэшце, даць сваё заключэньне, які цэх, зьмена ці аддзел, якія рабочыя далі лепшыя вынікі спаборніцтва, што заслугоўвае прэміяваньня.

У палове кастрычніка па заканчэньні работы ВКК склікаць выторчыя канфэрэнцыі рабочых з дакладам ВКК і гаспадарчага органу аб працы прадпрыемства і выкананьня К. Ц. 1928-29 году, аб ходзе спаборніцтва і выніках выкананьня дагавору. Прапановы ВКК абмеркаваць і зацьвердзіць на гэтых канфэрэнцыях.

УКЛЮЧЫЦЬ У ДАГАВОРЫ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ГАСПАДАРНІКАЎ

У праверцы ходу сацыялістычнага спаборніцтва трэба самаму шырокаму грамадзкаму агляду падпарадкаваць работу гаспадарчага органу і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу прадпрыемстваў. У прыватнасьці, трэба праверыць, як выконваюцца гаспадарчымі органамі дэкрэт СНК «Аб выторчых нарадах» і дырэктывы ВСНГ аб прэміяваньні за прапановы рабочых і выторчых нарад і дапамозе фабрычна-заводзкаму вынаходніцтву. У новыя дагаворы па сацыялістычным спаборніцтве трэба ўнесьці пэўныя абавязацельствы і з боку гаспадарчых органаў у сацыялістычным спаборніцтве, якія гарантавалі-б хуткае вырашэньне ўсіх пытаньняў, што вынікаюць у ходзе спаборніцтва і залежаць ад адміністрацыі, і гарантавалі-б шпаркае зьнішчэньне ўсіх непаладак на выторчасьці.

АГЛЯД ВЫНАХОДНІЦТВА — ЧАСТКА АГУЛЬНАГА АГЛЯДУ

Адначасова з аглядам ходу сацыялістычнага спаборніцтва трэба правесьці і агляд [illegible] работы па вынаходніцтве на прадпрыемстве. Агляд вынаходніцтва—гэта адна з складаных частак агульнай работы па сацыялістычным спаборніцтве, накіраваная да таго, каб у перадавыя шарэнгі сацыялістычнага спаборніцтва высунуць найбольш самадзейны і творчы атрад рабочае клясы—рабочых-вынаходцаў.

БЯЗ ХІСТАНЬНЯЎ ПЕРААБРАЦЬ СЛАБЫХ КІРАЎНІКОЎ

Трэба зрабіць суровую праверку рабоце выторчых камісій: як кіравалі яны справай спаборніцтва, ці справіліся выторчыя камісіі ў іх цяперашнім складзе са сваёй роляй баявога штабу сацыялістычнага спаборніцтва. Трэба бяз хістаньняў ,рашуча паставіць пытаньне аб пераабраньні тых выторчых камісій, склад якіх ня здолеў кіраваць сацыялістычным спаборніцтвам, і абраць новы, энэргічны і працаздольны склад выторчых камісій.

Праверка вынікаў спаборніцтва ўнутры ў прамысловасьці павінна была быць адначасова і праверкай вынікаў спаборніцтва паміж прамысловасьцю і сельскай гаспадаркай. У пэрыяд перазаключэньня дагавароў сацыялістычнае спаборніцтва паміж горадам і вёскай павінна ахапіць вялізную масу новых прадпрыемстваў, сёл і вёсак. Прадпрыемствы павінны камандываць рабочыя брыгады ў вёскі, што ўступілі ў спаборніцтва, у мэтах праверкі вынікаў спаборніцтва сярод сялянства і ўплыў на больш шырокае разгортваньне яго.

Правядзеньне масавага агляду ходу сацыялістычнага спаборніцтва і перазаключэньне дагавароў у прамысловасьці, бязумоўна, прыцягне шырокую ўвагу грамадзкасьці. Агляд спаборніцтва рабочых павінен паслужыць магутным штуршком да шырокага ахвату хваляй спаборніцтва ўсёй масы работнікаў устаноў дзяржаўнага, гандлёва-каапэрацыйнага апарату і работнікаў культурна-бытавых устаноў. Сацыялістычнае спаборніцтва работнікаў устаноў, што абслужваюць працоўнае насельніцтва, павінна ставіць сваёй асноўнай задачай такое паляпшэньне работы сваёй установы, якое забясьпечвала-б найлепшае абслугоўваньне патрэб рабочых і ўсіх працоўных гэтых устаноў.

Таму ЎсеЦСПС лічыць мэтазгодным арганізаваць спаборніцтва паміж прадпрыемствамі і работнікамі культурна-бытавых устаноў, гандлёва-каапэрацыйнай сеткі і дзяржапарату.

Падводзім вынікі

На пабудовах Беларусі пачалася масавая праверка выкананьня дагавароў сацыялістычнага спаборніцтва.

На Асінбудзе падлікі паказалі, што за час спаборніцтва працдысцыпліна паднялася, прадукцыйнасьць працы павялічылася на вузкакалейцы (нагрузка балясту) на 20 проц., у сьлясарна-мэханічнай майстэрні ад 15 да 30 проц., у сьлясарна - мэханічнай майстэрні рабочыя два разы добраахвотна зьніжалі сабе расцэнку.

Рабочыя Дубрэўскай лініі зьнізілі кошт перавозкі матар'ялаў на 20 проц., на Віцебскай лініі—на 7 проц.

На пабудове сталых жылых дамоў у пасёлку Арэхі арцель каменшчыкаў павялічыла прадукцыйнасьць працы на 4 проц. Гэта арцель першая перайшла на работу з унутранымі рыштаваньнямі, што дасьць па ўсім жыльлёвым будаўніцтве Асінбуду 60 тысяч рублёў эканоміі.

На торфараспрацоўках кожная машына выпускае звыш нормы штодзённа 9 тысяч штук тарфяной цэглы.

Гэтымі днямі на пашыраным пасяджэньні выторчай нарады ўнівэрсытэцкага гарадка ў **Менску** прадстаўнік будаўнікоў дрэваапрацоўчага камбінату ў **Бабруйску** дакладваў аб ходзе выкананьня сацыялістычнага дагавору, які быў заключаны з гарадком.

Зараз перад будаўніцтвам камбінату стаіць важная задача—пусьціць да 1-га кастрычніка фанэрную фабрыку. Калі гэта ня будзе выканана, дык дзяржава пацерпіць паўтара мільёна рублёў страты, бо ўсе матар'ялы для фабрыкі падрыхтаваны. Будаўнікі Бабруйску запэўняюць менскіх рабочых, што фабрыка будзе пушчана ў тэрмін. Ударная брыгада бэтоншчыкаў раней тэрміну скончыла бэтаніраваньне каменнай падлогі фабрыкі. Работа ідзе самым хуткім тэмпам.

РАБКОРЫ!

Сёньнешні аддзел, прысьвечаны пытаньню, як праводзіць праверку выкананьня сац. дагавароў, зьяўляецца найлепшым інструкцыйным лістом для ўсіх рабкораў. Рэдакцыя «Зьвязды» просіць слаць лісты аб тым, як ідзе праверка выкананьня сац. дагавароў, ці ўдзельнічае маса ў праверцы, што дало канкрэтна сац. спаборніцтва.

Асабліва трэба зьвярнуць увагу на формы, дзякуючы якім сац. спаборніцтва дало найбольшы эфэкт, гэта патрэбна для перадачы даных форм другім прадпрыемствам.

Падпарадкаваць вострай крытыцы тыя прадпрыемствы, дзе сац. спаборніцтва дрэнна арганізавана і кепска праводзіцца праверка выкананьня дагавароў.

Ганьбім супрацоўніцтва ў белагвардзейскай прэсе

Антысавецкі ўчынак Б. Пільняка

Сакратарыят праўленьня БелАПП'у прыняў рэзалюцыю, у якой пратэстуе супроць учынку расійскага пісьменьніка Б. Пільняка. Б. Пільняк надрукаваў у белагвардзейскім выдавецтве «Петраполіс» у Бэрліне сваю яўна антысавецкую аповесьць «Красное дерево», у якой узводзіць паклёп на Савецкі Саюз, на наша сацыялістычнае будаўніцтва. БелАПП сыгналізуе аб магчымасьці такой небясьпекі ў БССР в боку некаторых пісьменьнікаў і заклікае ўсіх пісьменьнікаў і ўсю Савецкую грамадзкасьць выказаць свой голас пратэсту супроць антысавецкага ўчынку Б. Пільняка.

Сакратарыят праўленьня БелАПП'у.

Беларускае бюро ІТС аб аварыі на каналізацыйных работах

Рэспубліканскае бюро ІТС пры саюзе будаўнікоў абгаварыла пытаньне аб аварыі на каналізацыйных работах у Менску.

Бюро прышло да вываду, што ў гэтай справе ёсьць нядбайнасьць з боку адміністрацыі бэтоннага заводу. Завод, прыняўшы такі важны заказ, як загатоўка значнай партыі бэтонных кругоў, не паклапаціўся аб тэхнічным наглядзе за работай. Ёсьць упушчэньне і з боку Водаканалу, які невыстарчальна сур'ёзна аднёсься да прыёмкі труб, не праверыў іх якасьці.

Бюро знайшло патрэбным зрабіць аналіз якасьці бэтону, цэмэнту, арматуры, з якіх выраблялісь трубы. Для работы ў спэцыяльнай камісіі вылучаны інжынэр **Камінскі.**

Новыя аддзяленьні ў тэхнікуме шляхаў зносін

Дорпрафсож Зах. чыгунак запрапанаваў аддзелу асьветы адкрыць у Беларусі курсы работнікаў тарыфна-нармёраваньня бюро і тэхнікі безапаснасьці. Фабзавуч чыгуначнікаў будзе рыхтаваць у далейшым, галоўным чынам, кацельшчыкаў і электрасварщчыкаў. Перад цэнтрам настаўлена пытаньне аб пашырэньні гомельскага тэхнікуму шляхаў зносін і адкрыцьці пры ім новых аддзяленьняў — шляхавага і электра-тэхнічнага.

Першыя трамвайныя вагоны будуць атрыманы ў верасьні

Гарсавет атрымаў тэлеграму ад кіраўніка трамвайнага будаўніцтва тав. **Кадушына,** які зараз знаходзіцца ў Маскве, што першыя 5 трамвайных вагонаў будуць адгружаны ў Менск у канцы верасьня, а другія пяць вагонаў да 10 кастрычніка.

Прэзыдыум гарсавету запрапанаваў трамвайнаму кіраўніцтву безадкладна скончыць усе трамвайныя работы в тым, каб пры атрыманьні першых вагонаў, трамвай можна было пусьціць.

Забесьпячэньне рабочага насельніцтва гароднінай

12-га верасьня на пасяджэньні гандлёва-каапэрацыйнай сэкцыі Менскага гарсавету была заслухана інфармацыя ЦРК аб пэрспэктывах забесьпячэньня рабочага насельніцтва Менску гароднінай.

Сёлета ЦРК павялічвае гандаль гароднінай на 100 проц. На асеньня-зімовы пэрыяд будзе загатоўлена 7.610 тон гародніны на суму 262 тысячы руб. Будзе загатоўлена 4.800 тон бульбы, 200 тон буракоў, засолена 1 мільён агуркоў і г. д. Усяго на закупку гароднины будзе адпушчана мільён руб. супроць 500 тысяч руб. у мінулым годзе.

Для лепшага абслугоўваньня насельніцтва гароднінай будзе пашырана сетка крам. Пры пабудове новых рынкаў на плошчы Парыскай Камуны і ў Сьвярдлоўскім раёне прадугледжваецца пабудова павільёнаў гароднины і г. д.

Паведамленьні

АД ЦКК КП(б)Бел.

У панядзелак, 30-га верасьня, а 6 з палов. гадз. увечары адбудзецца пасяджэньне Парттрэйкі ЦКК КП(б)Бел (Менск, Савецкая 55, 3-ці паверх, пакой № 18), дзе будуць разглядацца справы наступных таварышоў:

Катаеўскага В. В. быўш. у Мазырск. арганіз., Жыткавіцкага раёну. Жукоўскі А. І. быўш. у Мазырск. арг., Чэрнікаў М. А. быўш. Аршанск. арганіз. Гэтыя таварышы павінны зьявіцца на вызначаны час. Праезд за свой кошт.

Кастрычнікавы райком КП(б)Б паведамляе, што прапрацоўка пастановы XVI-й партыйнай канфэрэнцыі па групах адбудзецца ў панядзелак 16-га верасьня, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу Леніна (былая Чырвоная Заля).

Усе таварышы, вылучаныя на гэтыя курсы павінны зьявіцца без спазьненьня.

— Кастрычнікавы Райком ЛКСМБ паведамляе, што ў панядзелак 16-га верасьня г. г. роўна а 6 з пал. гадз. увечары, ў памяшканьні клюбу Розы Люксэмбург (рог Урыцкага і Карла Маркса) адбудзецца пашыраны Пленум Райкому ЛКСМБ з шырокім удзелам ячэйкавага актыву, з наступнай абесткай дню:

1) Даклад аб становішчы работы Кастрычнікавай арганізацыі.

2) Аб паасобных членах РК.

На пленум павінны зьявіцца: усе члены і кандыдаты бюро яч., арганізатары груп «лёгкай кавалерыі», піянэры-працаўнікі, эканомпрацаўнікі, кіраўнікі ўдарных камсамольскх брыгад, рэдактары насьценгазэт—камсамольцы і ўсе арганізатары ячэйкавых дабраахвотных груп.

Білеты на пленум для актыву трэба атрымаць у РК ЛКСМБ.

— *Дом Асьветы.* Сёньня, роўна а 6 г. ув., адбудзецца агульны сход жанчын—сяброў саюзу працасьветы (тэхпрацаўніц, настаўніц), а таксама і ўтрыманак сяброў саюзу працасьветы.

Абестка дня: 1) Справаздача дэлегатак аб сваёй працы.

2) Справаздача дзіц. пляцоўкі аб арганізацыі дзіцячага саду.

3) Аб удзеле настаўніц у рабоце жанаддзелу.

4. Бягучыя справы.

Просьба да ўсіх зьявіцца без спазьненьня.

— *Бібліятэка клюбу будаўнікоў* прапануе ўсім падпісчыкам бібліятэкі, якія прапусьцілі законны тэрмін, зьвярнуць кнігі ў тыднёвы тэрмін. У выпадку не звароту кніг, бібліятэка будзе вымушана прад'явіць судовы іск.

— У панядзелак, 16 верасьня, у памяшканьні Фізычнага габінэту рабфаку а 2-й гадзіне пачынаюць працаваць курсы па падрыхтоўцы таварышоў, якія камандыруюцца на хэміка-тэхнічны факультэт БДУ ў ліп 25.

Усім т. т. прапануецца зьявіцца без спазьненьня.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Дом Пісьменьніка

Беларуская Асацыяцыя Пралетарскіх Пісьменьнікаў (БелАПП) у нядзелю, 15 верасьня, а 8-ай гадзіне ўвечары, у Доме Пісьменьніка (Савецкая, 68)

наладжвае ЖАЛОБНЫ ВЕЧАР,

прысьвечаны памяці ПАЎЛЮКА ТРУСА

Праграма вечару:
1) Даклад аб творчасьці Паўлюка Труса Міколы Аляхновіча.
2) Успаміны таварышоў.
3) Чытка твораў, прысьвечаных памяці П. Труса.
4) Мастацкая частка.

УВАХОД ВОЛЬНЫ.

Государственное Сельскохозяйственное Издательство „НОВАЯ ДЕРЕВНЯ“ ОБ'ЯВЛЯЕТ ПОДПИСКУ НА ЗАОЧНЫЙ

„СЕЛЬСКО-ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ ПОЛИТЕХНИКУМ НА ДОМУ“ В СОСТАВЕ 9-ти СПЕЦИАЛЬНЫХ и 1-го ПОДГОТОВИТЕЛЬНОГО (общеобразовательного) ОТДЕЛЕНИЙ.

ПОД РЕДАКЦИЕЙ: члена коллегии Наркомпроса ВЫШИНСКОГО, А. Я., члена коллегии Наркомзема КЛИМОВА, С. А., ректора Тимиряз. с.-х. Академии ШЕФЛЕРА, М. Е., профессоров: БУШИНСКОГО, В. П., ВИЛЬЯМСА, В. Р., ЛИСКУНА, Е. Ф. и ЧАЯНОВА С. К.

Учебный план отделений построен применительно к программам сельско-хозяйственных техникумов Наркомпроса и разбит на I-й, II-й, III-й курсы обучения.

I ОТДЕЛЕНИЕ.	II ОТДЕЛЕНИЕ.	III ОТДЕЛЕНИЕ.	IV ОТДЕЛЕНИЕ.	V ОТДЕЛЕНИЕ.	VI ОТДЕЛЕНИЕ.	VII ОТДЕЛЕНИЕ.	VIII ОТДЕЛЕНИЕ.	IX ОТДЕЛЕНИЕ.	X ОТДЕЛЕНИЕ.
Подготовительное (общеобразовательное) Ответств. руководители Шарапов В. Ф. и проф. Бушинский, В. П.	Полеводство и поднятие урожайности. Ответств. руководители проф. Вильямс, В. Р. и проф. Чаянов, С. К.	Животноводство, молочное дело и птицеводство. Ответств. руководитель проф. Лискун, Е. Ф., уч. агр. Клейн, Н. О.	Лесное хозяйство. Ответств. руководители проф. Кобранов, Н. П. и Бутковский, А. М.	Садово-огороднич. и пчеловодство. Ответств. руководитель проф. Эдельштейн, В. И.	Землеустройство. Ответств. руководитель пр.-доц. Шулейкин, И. Д., и проф. Рудин, Н. П.	Мелиорация. Ответств. руководитель проф. Костяков А. Н. и проф. Бушинский, В. П.	Ветеринария. Ответств. рук. Ивлетов А. Н. и проф. Шемиот-Полочанский, Е. А.	Организация советских и колл. хозяйств. Ответств. руководитель проф. Гордеев, Г. С.	Машинно-тракторных станций. Отв. рук. Шефлер, М. Е. и Фабрикант, Я. О.
ПОДПИСНАЯ ЦЕНА: за весь курс обучения—10 руб.	ПОДПИСНАЯ ЦЕНА: 1 курс . . . 1 р. 50 к. 2 курс . . . 2 р. 50 к. 3 курс . . . 3 р. 50 к. ВСЕГО . . 7 р. 50 к.	ПОДПИСНАЯ ЦЕНА: 1 курс . . . 1 р. 50 к. 2 курс . . . 2 р. 50 к. 3 курс . . . 3 р. — к. 7 р. — к.	ПОДПИСНАЯ ЦЕНА: 1 курс . . . 1 р. 50 к. 2 курс . . . 2 р. 50 к. 3 курс . . . 3 р. — к. 7 р. — к.	ПОДПИСНАЯ ЦЕНА: 1 курс . . 1 р. 50 к. 2 курс . . 2 р. 50 к. 3 курс . . 3 р. — к. 7 р. — к.	ПОДПИСНАЯ ЦЕНА: 1 курс . . 1 р. 50 к. 2 курс . . 2 р. 50 к. 3 курс . . 3 р. — к. 7 р. — к.	ПОДПИСНАЯ ЦЕНА: 1 курс . . 1 р. 50 к. 2 курс . . 2 р. 50 к. 3 курс . . 3 р. — к. 7 р. — к.	ПОДПИСНАЯ ЦЕНА: 1 курс . . 3 р. — к. 2 курс . . 5 р. — к. 3 курс . . 6 р. — к. 14 р. — к.	ПОДПИСНАЯ ЦЕНА: 1 курс . . 2 р. — к. 2 курс . . 4 р. — к. 3 курс . . 4 р. — к. 10 р. — к.	ПОДПИСНАЯ ЦЕНА: 1 курс . . . 2 р. — к. 2 курс . . . 3 р. 50 к. 3 курс . . . 4 р. 50 к. 10 р. — к.

«Сельскохозяйственный политехникум на дому» рассчитан на лиц, имеющих общеобразовательную подготовку в об'еме низших сельскохозяйственных школ, школ крестьянской молодежи, курсов и др. Для лиц, не имеющих никакого школьного образования или соответствующей общеобразовательной подготовки (а умеющих лишь читать, писать и считать), организовано при «Сельскохозяйственном политехникуме на дому» подготовительное отделение, дающее общее образование, необходимое для изучения специальных предметов. Окончившим «Сельскохозяйственный политехникум на дому» **ВЫДАЕТСЯ СВИДЕТЕЛЬСТВО. ЗВАНИЕ И КВАЛИФИКАЦИЯ ДАЮТСЯ** при условии сдачи испытания в государственной квалификационной комиссии. Первые выпуски «Сельскохозяйственного политехникума на дому» выходят 1-го ноября 1929 года. Открыта подписка на все три курса по соответствующим отделениям. Для всех желающих при «Сел.-хоз. политехникуме на дому» **ОРГАНИЗОВАНА ПЛАТНАЯ ЗАОЧНАЯ УЧЕБНАЯ КОНСУЛЬТАЦИЯ.**

ПОДПИСКА ОТКРЫТА: Москва, проезд Художественного театра, д. № 4. Государственное сельскохозяйственное издательство «Новая Деревня». **В ОТДЕЛЕНИЯХ ИЗДАТЕЛЬСТВА:** Ленинград, Проспект 25 октября, 13. Самара, Советская ул. Областной дом крестьянина. Саратов, ул. Республики, 14.

Все денежные переводы направлять в Москву по вышеуказанному адресу. Подробные проспекты с условиями обучения в «С.-х. политехникуме на дому» высылаются за 10 коп. почтовую марку.

УВАГА! Кіно-тэатры **БЕЛДЗЯРЖКІНО** („Культура“, „Інтэрнацыянал“, „Пралетары“ і „Юны Піянэр“) **перайшлі на бесьперапынны рабочы тыдзень** Зьмена карцін па панядзелках

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР Музыкальная камэдыя і кам. опэра пад маст. кіраўн. Л. Г. МІРАЕВА.
АПОШНІЯ СПЭКТАКЛІ
Нядзеля, 15 верасьня **„Холопка“** у 3-х дзеях СТРЭЛЬНІКАВА
Пачатак а 8 з пал. гадз.
Панядзелак, 16 верасьня **„Лиса Патрикеевна“** у 3 дзеях ГЕРВЕ
Пачатак а 8 з пал. гадз.

КІНО-ТЭАТР „Культура“ — Гістарычны мастацкі баявік **ДЖАНКІ** 1-я сэрыя ў 7 частках. Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г.
Кіно-сад ЦЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — Новы бытавы фільм **НЕ ПА ДАРОЗЕ** мастацкая бытавая драма. Звыш праграмы: выступленьне папулярнага сатырыка **Л. БРАУНА** зусім новы рэпэртуар. Пачатак а 8 г. 30 м. Каса—ад 7 гадз.
КІНО Інтэрнацыянал — Бліскучая камэдыя выторч. „УФА“ **НЯВЕСТА БОКСЭРА** У галоўнай ролі КЭНІЯ ДЭСЬНІ і ВІЛЬЛІ ФРЫТЧ
КІНО Пралетары — Па прычыне вялікага посьпеху—другі тыдзень **ПАТ І ПАТАШОН** у замежным фільме **СІЛА і ХАРАСТВО** арыгінальная камэдыя ў 6-ці частках. Пачатак а 7 з пал. гадз. Каса—ад 6 гадз.
1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр“ — Новы фільм **БЯСПРЫТУЛЬНЫЯ** Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Пачатак 1-га сэансу а 3 г. 30 х., 2-га—а 5 г. Цана білета 10 к. Месцы нумараваныя.
КІНО СПАРТАК — Звыш праграмы гастролі С. Л. Чарнецкай-Бэнуа выканальніцы сьпеваў новага быту і шуточных народных. НА ЭКРАНЕ выдатны нямецкі баявік **МІЛЬЁН ЗА ВЯЧЭРУ** арыгінальная кіно-п'еса ў 8 частках. У гал. ролі ОСІ АСВАЛЬД Каса—ад 5 г. 30 м. Пачатак а 7 г. 15 м.

ЗАОЧНЫЕ ГОСКУРСЫ РОСПИСИ (РАЗРИСОВКИ). Роспись по всевозм. тканям: мягким золот., серебр., масляв., рельефн. аппликац. (не расплыв.) кр ясками. Бисер., жемчуж. и мерцающ. пересыпками. Роспись по сосудам. стеклу, целлулоиду, коже и дереву. Полный курс, 12 уроков, в 4 месяца. К урокам дается свыше 100 рис. (кроме текстовых). По окоч. выд. свид. Уменьш рис. не требуется. Проспект и программа высыл. за 20 коп. мелк. марк.
МОСКВА, УЛ. ДЗЕРЖИНСКОГО, Д. 7.
ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ СОНО

Кіно „Інтэрнацыянал“ Ад панядзелка, 16 верасьня — мастацкі бытавы фільм Па апавяданьні В. Бахмецьцева
ПЕРАГОН СЬМЕРЦІ
драма ў 6 частках.
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: А. Чысьцякоў, К. Ефімаў, В. Сямёнава, М. Шлёнская.
УВАГА! кіно-тэатр перайшоў на бесьперапынны рабочы тыдзень. Зьмена карцін па панядзелках.
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 15 м. Каса—ад 5 г. 30 м

Кіно „ПРАЛЕТАЫ“ АД ПАНЯДЗЕЛКА, 16 ВЕРАСЬНЯ, вясёлая камэдыя сэзону **„ШЧАСЬЛІВЫЯ КОЛЬЦЫ“** па матывах п'есы В. Катаева «Ножы». Рэжысэры ГОЛУБ і САДКОВІЧ. У галоўн. ролях: В. ЧУВЕЛЕЎ, Е. РАЦІНСКАЯ, Е. НЕЧАЕВА
— Звыш праграмы КІНО-ХРОНІКА № 46 —
1-е ЖНІЎНЯ ў МАСКВЕ
1) Буйныя дэманстрацыі на маскоўскіх заводах.
2) Карнавальны паход па вуліцах Масквы.
3) Антываенны мітынг у парку «Культуры і адпачынку»; выступалі: Уншліхт, Калінін, Максім Горкі
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 м., 2-га сэансу а 9 г., 3-га сэансу а 10 г. 30 м.
— КАСА—АД 6 ГАДЗ. —

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА“ Ад панядзелка, 16 верасьня **ТОЛЬКІ 3 дні: 16, 17 і 18 верасьня** і апошняя сэрыя **2-ая** гістарычнага фільму **ДЖАНКІ** у 7 частках
Пачатак сэансаў а 7 гадз. увеч.
— КАСА—АД 5 ГАДЗ. —
Увага! Ад чацьвярга, 19 верасьня выдатны фільм вытворчасьці Белдзяржкіно **Джэнтльмэн і певень**

КІНО СПАРТАК перайшоў на бесьперапынны рабочы тыдзень
Ад панядзелка, 16 верасьня, чарговая пастаноўка Сэнсацыя Нью-Ёрку, Бэрліну і Парыжу
ГАРПУН (Забойства напітана)
— Драма ў 8 част. —
Пачат. 1-га сэансу а 7 г. 15 м. — Каса—ад 5 г. 30 м.

1-ы дзіцячы кіно-тэатр «ЮНЫ ПІЯНЭР» (будынак кіно „ПРАЛЕТАРЫ“) Ад ПАНЯДЗЕЛКА, 16 ВЕРАСЬНЯ Гістарычны фільм з эпохі Пугачоўшчыны на Русі
БУЛАТ-БАТЫР у 7 частках
Рэжысэр ТАРЫЧ
Кіно адчынена штодня ад 2 гадз. дня
ПАЧАТАК 1-га сэансу ад 3-х гадз. 30 хв., 2-га а 5 гадз.
Па нядзелях кіно адчынена ад 12 гадз. дня
цана білета 10 кап. Месцы нумараваныя

КУРСЫ ЯЗЫКОВ и СТЕНОГРАФИИ
КОЛЛЕКТИВА ПРЕПОДАВАТЕЛЕЙ, состоящие в ведении Наркомпроса
Запись новых слушателей и регистрация старых—по вторникам, четвергам, пятницам и субботам 6—8 ч. веч., ул. Энгельса, 33, 24-я Сов. школа.

ДАЮ УРОКИ Немецкого, анг[illegible]ского и французского языков, Мальбин. Воскресенская, 19—4.

50 к. Кошт публікацыі аб згубе дакумэнту

МЕНСКІ АКРУГОВЫ ФІНАНСАВЫ АДДЗЕЛ абвяшчае, што ім назначаны **таргі** НА ПРОДАЖ ніжэйнаступнай маемасьці, якая належыць Лейзару і Якаву Фрэдзіным, ЗА НЯВЫПЛАТУ ПАДАТКАЎ,
— У НАСТУПНЫМ ПАРАДКУ: —
17 верасьня 1929 г. а 10 гадзіне раніцы ў саўгасе «Габрылелёўка», Пухавіцкага раёну:
Стойкі 6 куб. м. кражаў шпальных 23 з палов. куб. м., лесаматар'ял (скрыначны) 441 куб. м., яблычных скрынак адинаццатовых 1.000 камплектаў.
21 верасьня 1929 г. а 10 гадзіне раніцы на станцыі Рудзенок:
Птушыных скрынак 1000 камплектаў, галовак да птушыных скрынак 1080 штук, яблычных (пудовых) скрынак 3000 камплектаў, розных дошчачак каля 400 куб. ф., стандартных галовак да яблычных скрынак 185 пачак.
19 верасьня 1929 г. а 10 гадзіне раніцы ў м. Шацк, Пухавіцкага раёну:
Лякамабіль 24 конскіх сіл, мукамольная застаўка 7-4, крупадзёрка паўаўтамат, трансьмісія, цыркулярны варштат, варштат для нарэзкі піл, будынак млыну драўляны, будынак мешынага аддзяленьня, дашчатая паветка, будынак быўшага вадзянога млыну.
Усе даведкі аб таргох можна атрымаць штодзенна ў Акрфінадзе. у нам. заг. акрфа тав. БАЙДАЛІНАЙ.
МЕНАКРФА.

ЗАОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ
Курсы рыхтуюць работнікаў для нізавых каапэрацыйных арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцеляй усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.
Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.
Прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 4 груп сямігодкі. Прыём адбываецца круглы год.
Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведнае пасьведчаньне.
Плата за курс 33 руб. уносіцца так: 9 руб. пры паступленьні, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8 месяц і па 4 руб. штомесячна ў пачатку кожнага навучальнага месяцу. Умовы прыёму высылаюцца за 2 дзесяцікапеечныя марні.
Грошы пераводзяцца па адрасе: Менск, Усекабанк, бяг. рахунак № 683. Усю карэспанденцыю накіроўваць: Менск, Усекабанк, Завочным курсам.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2 гадзіны дня